РАДЫЁ у ГАДЗ. НОЧЫ:

МАСКВА, 19. Пастановай СНК СССР, камандуючы войскам Маскоўскай ваеннай акругі т. Убарэвіч назначаны членам Рэвваенсавету СССР. Загадам Рэвваенсавету СССР т. УБАРЭВІЧ назначаны начальнікам узбраеньняў РСЧА. Камандуючы войскам МВА назначаны т. КОРК.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 265 (3373) Серада 20 лістапада 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Сазонова, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сэкретар—619, кантора—78.

АДОШНІЯ НАВІНЫ **Б. С. С. Р.**

МАГІЛЕЎ, (Наш кар.) Пачалася праверка працы Магілеўскага акрэа. Праверку робіць спэцыяльная камісія ЦКК Беларусі, якая таксама абсьледуе працу зямельных аддзелаў Касьцюковіцкага і Магілеўскага раёнаў.

Для практычнай дапамогі ў працы камісіі вылучаны на заводзе «Адраджэньне» і Лекерт» дзьве рабочыя брыгады па 5 чалавек у кожнай.

ПЛЕНУМ ЦК УсеКП(б)

Рэзалюцыя аб падрыхтоўцы тэхнічных кадраў

(Ухвалена пленумам ЦК УсеКП(б) 16-га лістапада па дакладу тав. КАГАНОВІЧА)

Праблема кадраў у рэканструкцыйны пэрыяд

Гіганцкі размах сацыялістычнага будаўніцтва, ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну, які зьяўляецца практычным выяўленьнем лёзунгу партыі «дагнаць і перагнаць» перадавыя капіталістычныя краіны і, нарэшце, абвастрэньне клясавай барацьбы ў краіне ставяць перад партыяй ва ўсёй шырыні і вострасьці праблему кадраў у рэканструкцыйны пэрыяд.

Недахоп кваліфікаваных тэхнічных і кіраўнічых кадраў, які існаваў у працягу раду год, асабліва абвастрыўся ў сучасны пэрыяд бурнага разгортваньня прамысловасьці і сацыялістычнае перабудовы сельскае гаспадаркі. Мінулы год (фактычна перавышэньне вызначаных пяцігадовым планам тэмпаў гаспадарчага разьвіцьця, выкрыцьцё раду новых шкодніцкіх спраў) ставіць з яшчэ большай вострасьцю пытаньне аб усямерным фарсаваньні і паляпшэньні справы падрыхтоўкі новых пралетарскіх спэцыялістых. Сучасны пэрыяд востра ставіць, у сувязі з новымі патрабаваньнямі, пытаньне ня толькі аб колькасьці, але і аб якасьці спэцыялістых. Разьвіцьцё прамысловасьці і сельскае гаспадаркі па падставе апошніх дасягненьняў сусьветнай навукі і тэхнікі, карэнная перабудова ўсяго вытворчага апарату, складанасьць сацыяльна-эканамічных працэсаў, якія зараз адбываюцца ва ўмовах барацьбы паміж сацыялістычнымі і капіталістычнымі элемэнтамі, патрабуюць новага тыпу тэхнічных кіраўнікоў і арганізатараў сацыялістычнае гаспадаркі, каторая будуецца (прамысловасьці, транспарту, сельскае гаспадаркі, фінансаў, каапэрацыі, гандлю і г. д.). Гэтыя кадры павінны ўладаць даволі глыбокімі спэцыяльна-тэхнічнымі і эканамічнымі ведамі, шырокім грамадзка-палітычным кругавідам і якасьцямі, патрэбнымі для арганізатараў вытворчай актыўнасьці шырокіх працоўных мас.

Між тым, тэмп падрыхтоўкі новых кадраў спэцыялістых не адказвае тэмпам індустрыялізацыі і сацыялістычнае перабудовы сельскае гаспадаркі. Мы стаімо перад вялізным «раздвижением ножниц» паміж попытам на спэцыялістых і цяперашнімі тэмпамі іх росту. Гэта можа стаць тормазам для далейшага пасьпяховага разьвіцьця сацыялістычнае гаспадаркі тым больш, што ў наяўнасьці ня толькі колькасны недахоп спэцыялістых, але і якасныя недахопы: недахопы іх тэхнічнай кваліфікацыі, нявыстарчальнасьць кваліфікацыі з пункту погляду эканамічнае асьветы, нарэшце, сацыяльна-палітычная няўстойлівасьць, нэйтральнасьць і нават варожасьць вядомай часткі наяўных кадраў спэцыялістых. Гэта апошняе знайшло сваё найбольш яскравае выяўленьне ў дзейнасьці асобных шкодніцкіх групаў, якія сьвядома разгортваюць сацыялістычную гаспадарку ў інтарэсах капіталізму. Вядучы рашучую барацьбу са шкоднікамі, скарыстоўваючы паранейшаму сумленна і добрасумленна працуючых спэцыялістых, сыстэматычна паляпшаючы абстаноўку іх работы, трэба ўсямерна ўзмацніць падрыхтоўку новых пралетарскіх спэцыялістых, на якіх савецкая ўлада магла-бы поўнасьцю і цалкам абаперціся ў сваёй вялікоэнай рабоце па будаўніцтве сацыялізму, якія задаволілі-б узрастаючыя патрэбы і маглі-б замяніць варожыя нам элементы з асяродзішча спэцыялістых і карэнным чынам налепшылі-б увесь кадравы склад прамысловасьці і гаспадаркі СССР у яго цэлым.

Правыя элемэнты ў партыі і прымірэнцы не разумеюць усёй вострасьці праблемы падрыхтоўкі новых кадраў у цяперашні пэрыяд. Яны фактычна змазваюць задачы фарсаваньня падрыхтоўкі новых кадраў пралетарскіх спэцыялістых. Гэта цалкам супадае з іх асноўным курсам на згортваньне тэмпаў індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскае гаспадаркі, на разьвязваньне капіталістычных адносін у краіне. Ня бачачы і не жадаючы бачыць абвастрэньня клясавай барацьбы ў краіне, правыя замазваюць факт палітычнай дыфэрэнцыяцыі сярод спэцыялістых і тэй барацьбы, якую клясавы вораг вядзе супроць сацыялізму — асобныя групы шкодніка ў.

Правыя не разумеюць, што ня толькі гаспадарчая патрэбнасьць, але і працэс палітычнага распластаваньня сярод спэцыялістых у абстаноўцы абвостранай клясавай барацьбы ў краіне з вялізарнейшай вострасьцю ставіць перад савецкай дзяржавай задачу падрыхтоўкі новых кадраў пралетарскіх спэцыялістых. Уся гэта ўстаноўка правых нічога агульнага ня мае з лініяй партыі. Партыя павінна згрупаваць усе свае сілы на вырашэньні праблемы кадраў, важнейшай для сацыялістычнага будаўніцтва.

Пяцігодка і забесьпячэньне яе кадрамі

1. Мінулы год цалкам і поўнасьцю пацьвердзіў правільнасьць лініі і практычных мерапрыемстваў, вызначаных ліпнёўскім пленумам ЦК 1928 г. аб паляпшэньні падрыхтоўкі новых спэцыялістых і значнага пашырэньня гэтай праграмы.

Аднак, адзначаючы вядомыя дасягненьні ў рабоце па паляпшэньні падрыхтоўкі новых спэцыялістых (наблюжэньне да вытворчасьці, паляпшэньне сацыяльнага складу, паляпшэньне матар'яльнага становішча студэнцтва і г. д.), ЦК канстатуе, што рашэньне ліпнёўскага пленуму ажыцьцяўлялася нездавальняюча. як органамі Наркамасьветы і ВСНГ, так і прафсаюзнымі і партыйнымі арганізацыямі. Падрыхтоўка новых спэцыялістых яшчэ не абярнулася «ў важнейшую задачу». Характарыстыка, даная справе падрыхтоўкі спэцыялістых на ліпнёўскім пленуме, у асноўным застаецца ў моцы і для сучаснага пэрыяду. Работа па забесьпячэньні пяцігодкі кадрамі пастаўлена зусім нездавальняюча і бяз колькі-небудзь угрунтаваных плянаў, ... [1])

Лічачы, што намечанае будаўніцтва на працягу пяцігодкі новых 47 ВТНУ і 172 тэхнікумаў недастаткова для поўнага задавальненьня патрэб пяцігодкі, асабліва ў тэхніках, ЦК абавязвае Дзяржплян, ВСНГ, Наркамзем і Наркамасьветы распрацаваць у 3-хмесячны тэрмін пяцігадовы плян падрыхтоўкі сэцыялістых вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі і будаўніцтва новых ВТНУ і тэхнікумаў у адпаведнасьці з канкрэтнымі патрэбамі галін народнай гаспадаркі і яе асобных раёнаў.

Адначасова з гэтым неабходна пераглядзець сетку існуючых ВТНУ, надаўшы ім мэтавае значэньне і ліквідаваўшы паралелізм.

3. ВСНГ, Наркамасьветы, НКПС забясьпечыць ва ўстаноўленыя тэрміны выпуск спэцыялістых з функцыянуючых ВТНУ і тэхнікумаў. Давесьці выпуск у гэтым годзе да 20 проц. да агульнага кантынгенту вучашчыхся — для ВТНУ з 4-хгадовым тэрмінам навучаньня і да 25 проц. — для ВТНУ з 3-хгадовым тэрмінам. У мэтах павялічэньня прапускное здольнасьці ВТНУ перавесьці іх на бесьперапынны навуковы год і тыдзень.

4. Усямерна ўзмацніць на працягу бліжэйшых год падрыхтоўку кадраў практычных кіраўнікоў вытворчасьці з ліку найбольш сьвядомых рабочых, шляхам плянавага прасоўваньня іх з ніжэйшых камандных пасад да вышэйшых, пры адначасовым прадастаўленьні ім самых шырокіх магчымасьцяй у справе сыстэматычнага папаўненьня сваіх практычных ведаў і набыцьця неабходнай тэарытычнай асьветы. На працягу бліжэйшых трох гадоў перападрыхтаваць усю наяўную асноўную масу рабочых практыкаў, якія займаюць тэхнічныя пасады ў прамысловасьці і транспарце.

5. Паставіць сыстэматычную перападрыхтоўку практыкаў па сельскай гаспадарцы з сялян і рабочых, работнікаў калгасаў, саўгасаў і зямельных органаў. Саюзнаму Наркамазему сумесна з Наркамасьветы арганізаваць не пазьней студзеня 1930 г. па ўсіх асноўных сельска-гаспадарчых раёнах пры сельгасвузах і тэхнікумах тып паскораных курсаў для падрыхтоўкі агранамічна пісьменных работнікаў, у першую чаргу, для сельгасаў.

6. ЦК ухваляе прынятыя палітбюро рашэньні аб фінанасаваньні ВТНУ ў гэтым годзе (значнае перавышэньне сумы на капітальнае будаўніцтва, на лябараторыю, павялічэньне зарплаты пэдагагічнаму пэрсаналу, павялічэньне стыпэндый, пашырэньне практыкі кантрактацыі з унясеньнем у яе большага парадку і сыстэмы і г. д.). ЦК прапануе, адначасова з распрацоўкаю пяцігадовага пляну падрыхтоўкі новых кадраў спэцыялістых, распрацаваць пытаньне аб поўным іх матар'яльным забесьпячэньні (у тым ліку адзіночак), зацьвердзіўшы разам з пяцігадовым планам і суму, патрэбную на забесьпячэньне ВТНУ. ЦК пастанаўляе пры выпрацоўцы кантрольных лічбаў і дзяржбюджэту выходзіць з неабходнасьці сыстэматычнага павышэньня ролі затрат на тэхнічную асьвету і навукова-дасьледчую работу.

Перабудова навуковай работы ВТНУ

1. Ня гледзячы на некаторы посьпех у ажыцьцяўленьні рашэньняў ліпеньскага пленуму пры правядзеньні бесьперапыннай вытворчай практыкі ў навучаньні, гэта справа знаходзіцца яшчэ ў пачатковым становішчы. Саюзам неабходна: рашучае пашырэньне і якаснае палепшаньне вытворчай практыкі, павялічэньне вытворчай практыкі в давядзеньнем колькасьці мінімуму, аддаваемага вытворчаму навучаньню, да 40-50 проц.; устанаўленьне папаўненьня тэарытычнага навучаньня вытворчай практыкай на прадпрыемстве, прыстасоўна да асобных галін вытворчасьці.

(ПАРЦЯГ ГЛ. НА 2-й СТАРОНЦЫ)

[1]) Ва ўсіх мясцох рэзалюцыі, адзначаных радам кропак і адзінкаю пропускі па віне перадачы ТАСС.

Менская арганізацыя — на варце ленінскай лініі партыі

Поўнасьцю ўхваляем усе рашэньні пленуму ЦК УсеКП(б)

(Рэзалюцыя сходу менскага партактыву па дакладу тав. ВАСІЛЕВІЧА)

Заслухаўшы даклад сакратара ЦК КП(б)Б т. Васілевіча аб выніках лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б), актыў Менскай арганізацыі КП(б)Б цалкам і поўнасьцю ўхваляе ўсе пастановы пленума і поўнасьцю далучаецца да рашэньняў бюро ЦК КП(б)В і Менскага акругкому па гэтым пытаньні.

Актыў з задавальненьнем адзначае вялізарныя посьпехі за мінулы гаспадарчы год на галоўнейшых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва і лічыць, што гэтыя посьпехі дасягнуты супроць жаданьня правых апазыцыянэраў і зьяўляюцца непасрэдным вынікам цьвёрдага пасьлядоўнага правядзеньня ленінскай генэральнай лініі партыі— яны з відавочнай яскравасьцю даводзяць поўнае палітычнае банкруцтва правай апазыцыі.

Партактыў адзначае, што прынятыя пленумам на бягучы гаспадарчы год кантрольныя лічбы, якія даюць вялізарнейшыя тэмпы разьвіцьця сацыялістычнай гаспадаркі, зьяўляюцца ўпаўне рэальнымі і выцаўнімымі, што пацьвярджае вопыт мінулага гаспадарчага году.

Кантрольныя лічбы на 29-30 гасп. год значна перавышаюць наметкі пяцігадовага пляну і зьяўляюцца сапраўдным ажыцьцяўленьнем на практыцы ленінскага лёзунгу «дагнаць і перагнаць» капіталістычныя краіны на базе вядучай ролі цяжкай прамысловасьці.

Партактыў падкрэсьлівае, што стымуляваны шырока разгорнутай пралетарскай самакрытыкай моцны ўздым актыўнасьці рабочае клясы, знайшоўшы сваё яскравае выражэньне ў шырокім разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва, зьявіўся важнейшым фактарам дасягнутых палітычных і гаспадарчых посьпехаў і забясьпечвае тэмпы разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва, намечанага пленумам у кантрольных лічбах на 29-30 год.

Шырокі размах і моцны тэмп у росьце аграмаджанага сэктару сельскае гаспадаркі, а таксама датэрміновае выкананьне хлебанарыхтоўчага пляну ў шэрагу буйнейшых раёнаў яшчэ раз даводзяць правільнасьць генэральнай лініі партыі ў справе перабудовы мільнаў дробных і драбнейшых сельскіх гаспадарак, шляхам аграмаджаньня ў буйныя гаспадаркі, а таксама ў справе выхаду з хлебных цяжкасьцей, што поўнасьцю абвяргае хлусьню на партыю правых апартуністых.

Адзначаныя посьпехі ў перабудове і ўзьяняцьці сельскае гаспадаркі зьяўляюцца вынікам рашучай барацьбы з правай апазыцыяй, рашучага наступу на кулака на грунце ўзмацненьня саюзу рабочае клясы з бяднякам-серадняцкімі масамі сялянства.

Партактыў лічыць, што шпаркі тэмп аграмаджаньня сельскай гаспадаркі адначасова высоўвае ў якасьці ўдарнай задачы чыстку калгасаў ад кулацкіх элемэнтаў і скарыстаньне масавага працэсу калектывізацыі, які ахапіў вёску, для поўнай палітычнай ізаляцыі кулака.

Партактыў адзначае, што пленум зусім правільна ў поўнай адпаведнасьці з воляй усяе партыі прызнаў прапаганду правых поглядаў, правага апартунізму і прымірэнцтва з ім несумяшчальнымі з прыналежнасьцю да УсеКП(б).

Банкруцтва бухарынскай апазыцыі стала зусім відавочным. Лепшая частка яго групы ў часе пленума адыйшла ад апазыцыі,—усё ядро старога маскоўскага кіраўніцтва (Угланаў, Котаў, Міхайлаў, Кулікаў), парвала з правай апазыцыяй. Правадыры-ж правых уклапістых працягваюць чапляцца за асуджаныя партыяй погляды і тэорыі. Яны ня толькі не бяруць назад свае ранейшыя абвінавачаньні супроць партыі (ваенна-фэадальная эксплёатацыя, насаджэньне бюракратызму і г. д.), але выступілі на пленуме з новай плянформай барацьбы супроць партыі і дадаюць новыя абвінавачаньні, якія пераходзяць усялякія межы на сваёй хлусьлівасьці.

Пленум ЦК УсеКП(б) зусім правільна ацаніў двурушніцкую тактыку правых фракцыянэраў, як манэўр, які ня раз ужываўся трацкістымі, як часовае адступленьне для таго, каб напасьці на партыю пры першых-жа цяжкасьцях.

Партактыў Менскай арганізацыі лічыць зусім правільным вывад з палітбюро ідэолёга і правадыра правых ухілістых Бухарына і папярэджаньне, зробленае пленумам ЦК УсеКП(б) другім лідэрам апазыцыі (Рыкаў, Томскі). Актыў папярэджвае правых апазыцыянэраў, што найменшая спроба працягваць абарону антыленінскіх поглядаў і весьці барацьбу супроць лініі партыі павядзе за сабою прыняцьце жорсткіх арганізацыйных мер.

Менская арганізацыя пад ленінскім кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б вяла ўвесь час непрымірымую, рашучую барацьбу з права-ўхілісцкімі тэорыямі і практычнымі праявамі права ўхілу (Прышчэпаўшчына, справа Наркамасьветы, Белсампрамсаюзу, выступленьне нац.-дэмакр. на чыстцы яч. НКА і інш.).

Партактыў ад імя ўсяе арганізацыі заяўляе, што і ў далейшым Менская арганізацыя, як і ўся КП(б)Б, будзе верным праваднікам генэральнай ленінскай лініі партыі і моцнай апорай ленінскага ЦК УсеКП(б).

Менская арганізацыя будзе жорстка змагацца як з правым ухілам, найбольш небясьпечным на даным этапе, прымірэнчымі адносінамі да яго, а таксама і з рэшткамі трацкісцкіх настроў у выглядзе «левых» загібаў.

Партактыў заклікае партарганізацыі яшчэ шчыльней згуртаваць вакол ленінскага ЦК, мабілізуючы рабочых, батракоў і бяднякоў-серадняцкіх масы сялянства на практычнае ажыцьцяўленьне рашэньняў пленуму УсеКП(б).

Няхай жыве бальшавіцкі ЦК УсеКП(б), няўхільна праводзячы ленінскую лінію і бязьлітасна вядучы барацьбу з ухіламі ад генэральнай лініі партыі.

Няхай жыве саратнік Леніна—генэральны сакратар ЦК УсеКП(б) СТАЛІН.

10 год КІМ'у

(20-га лістапада 1919 г.—20 лістапада 1929 г.)

10 год таму назад, 20-га лістапада 1919 г. у Бэрліне быў створаны Камуністычны Інтэрнацыянал моладзі. У глыбокім падпольлі, хаваючыся ад паліцэйскіх ішчэк крывавага Носке—Шэйдэмана, 1-шы міжнародны кангрэс КІМ'у палажыў пачатак арганізаванаму камуністычнаму руху моладзі з яснай праграмай рэвалюцыйнай барацьбы супроць буржуазіі, супроць імпэрыялістычных войнаў, супроць сацыял-дэмакратыі—за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю, за саветы. Сацыялістычны рух моладзі, які паўстаў яшчэ да імпэрыялістычнай вайны пад кіраўніцтвам вялікіх і лепшых правадыроў рэвалюцыі Леніна і Лібкнэхта, быў адзнай з актыўнейшых частак левага крыла II-га Інтэрнацыяналу. У гады імпэрыялістычнай вайны маладыя пралетары, на якіх выпаў страшэнны цяжар вайны, хутка ўсьвядомілі лёзунгі Леніна і Лібкнэхта аб ператварэньні імпэрыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую. Сьцяг Леніна—Лібкнэхта, сьцяг рэвалюцыйнага марксызму, падняты супроць здрадніцкага рэфармізму II-га Інтэрнацыяналу, згуртаваў вакол сябе лепшыя сілы рабочае моладзі 1-шы міжнародны кангрэс КІМ'у, які адбываўся 10 год таму назад, аб'яднаў у адзін магутны Інтэрнацыянал гэтыя лепшыя сілы пралетарскай моладзі, каб арганізаваным і згуртаваным атрадам стаць у рады барацьбітоў за камунізм, за сусьветны Кастрычнік.

На перадавых барыкадах пралетарскай рэвалюцыі змагаліся на працягу ўсіх 10 год сэкцыі Камуністычнага Інтэрнацыяналу Моладзі. Згуртоўваючы ў сваіх радох найбольш сьмелыя і рэвалюцыйныя элемэнты працоўнай моладзі, КІМ быў на першай лініі крывавай барацьбы супроць буржуазіі. Пад кіраўніцтвам камуністычных партый і ўсяго Камінтэрну—камсамолы капіталістычных краін былі на працягу ўсіх 10 пражытых год—лепшымі баявымі атрадамі міжнароднай рэвалюцыйнай арміі. Яны адважна змагаліся пад лёзунгамі пралетарскай рэвалюцыі і ўсюды праяўлялі вялікую адданасьць справе Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Крывёю сваёю яны палівалі барыкады Кастрычніцкіх баёў 1923 г. у Нямеччыне; тысячы сваіх лепшых жыцьцяў яны аддавалі ў гэраічнай барацьбе Кітайскай рэвалюцыі; адважна глядзелі яны ў вочы сьмерці і захаплялі сваёй адвагай пралетараў на барыкадах Вены ў 1927 годзе і незабываных майскіх баёх Чырвонага Вэдынга і Нейкёльна ў 1929 годзе. Ня спыняючыся ні перад якімі ахвярамі, камсамолы капіталістычных краін на працягу ўсяго свайго існаваньня вялі і вядуць надзвычайна шырокую і актыўную анты-мілітарыстычную працу; працу ў радох імпэрыялістычных армій. Вялікія дасягненьні ў гэтай галіне французкага камсамолу вядомы ўсім змаганьнікам—камуністычным пралетарам сьвету. Пад сьцягам абароны Савецкага Саюзу і барацьбы супроць імпэрыялістычных войнаў камсамольцы ўсіх краін ідуць у рады буржуазных армій, каб разам з сабою ўносіць у гэтыя рады дух рэвалюцыйнай барацьбы супроць крывавых імпэрыялістых. Кам. саюзы моладзі вядуць рашучую барацьбу супроць белага тэрору фашызму, не баючыся турмаў, катаваньняў і паліцэйскіх прасьледваньняў. Нельга не адзначыць гэраічнай барацьбы, якую вядуць камсамольцы Польшчы і Заходняй Беларусі ва ўмовах жорсткага тэрору фашыстых, ва ўмовах глыбокага падполья. Тысячы лепшых маладых барацьбітоў пакутуюць у турмах буржуазіі, цьвёрда зносячы ўсе «прыгожасьці» засьценкаў Мусаліні і Мюлера, Пілсудскага і Тардзье, Чан Кай-шы і Макданальда.

У першых радох КІМ'у ішла і ідзе лепшая і перадавая сэкцыя—наш УсеЛКСМ. У мінулым—на фронтох грамадзянскай вайны, а цяпер—на фронце сацыялістычнага будаўніцтва УсеЛКСМ з вялікім посьпехам ідзе наперад і прыцягвае да сябе ўвагу працоўнай моладзі краін капіталу. З няменшым посьпехам змагаецца за пабудову сацыялізму ЛКСМ Савецкай Беларусі, які карыстаецца вялікай папулярнасьцю сярод рабоча-сялянскай моладзі Зах. Беларусі.

За ўсе гэтыя годы КІМ быў верным барацьбітом за бальшавіцкую ленінскую лінію Камінтэрну. КІМ актыўна змагаўся з апартунізмам і перажыткамі сацыял-дэмакратычнага мінулага і яго канкрэтным носьбітамі ў асобных сэкцыях Камінтэрну. КІМ змагаўся супроць трацкізму і за ачышчэньне Камінтэрну ад трацкісцкіх элемэнтаў, КІМ з бальшавіцкай непрымірымасьцю ўжо пасьля VI-га кангрэсу КІ, пад кіраўніцтвам Камінтэрну. прымаў актыўны ўдзел у бязьлітаснай барацьбе супроць апартуністых—Брандлераў, Лоўстанаў, Ільлекаў і інш. і за ачышчэньне сэкцый Камінтэрну ад усіх гэтых сацыял-дэмакратычных элемэнтаў. У апошні час Шведзкі камсамол вядзе актыўную і рашучую барацьбу супроць апартуністычных раскольнікаў тыпу Чыльбума і зьяўляецца верным памочнікам Камінтэрну ў справе барацьбы за Камінтэрнаўскую лінію ў кампартыі Швэцыі. КІМ аддаў не малую колькасьць сваіх лепшых прадстаўнікоў камуністычным партыям, такім чынам узмацняючы іх кіраўнічыя кадры.

КІМ адзначае свой 10-гадовы юбілей у абставінах новага нарастаючага рэвалюцыйнага ўздыму рабочага руху каніталістычных краін і новага абвастрэньня барацьбы калёніяльных народаў Індыі, Кітаю, Афрыкі. Сірыі і г. д. Разам з гэтым, КІМ уступае ў сваё другое 10-годзьдзе ў абстаўнах вялізарнай небясьпекі новых імпэрыялістычных войнаў і перад усім—контр-рэвалюцыйнай вайны супроць Савецкага Саюзу. На КІМ, у сувязі з усёй напружанай абстаноўкай «трэцяга пэрыяду»— пэрыяду абвастрэньня і паглыбленьня крызісу капіталізму, новага рэвалюцыйнага ўздыму і новых войнаў,—кладуцца адказныя задачы па заваяваньні большасьці працоўнай моладзі. Пад кіраўніцтвам Камінтэрну, сэкцыі КІМ'у перастройваюць свае рады, узмацняюць і абнаўляюць сваё кіраўніцтва, павышаюць сваю актыўнасьць, узмоцнена працуюць над колькасным павялічэньнем і паляпшэньнем якасьці працы сваіх арганізацый, уступаюць у міжнароднае рэвалюцыйнае спаборніцтва, актыўна працуюць над вырашэньнем новых задач новага пэрыяду. Вядучы рашучую барацьбу на два франты—супроць правага апартунізму і «левых» тэндэнцый, супроць прымірэнчых адносін да ўхілаў ад лініі Камінтэрну, згуртоўваючы цэнтральны агонь на галоўнай цяпер небясьпецы ў КІ—на правым апартунізьме, КІМ і надалей будзе з усёй большавіцкай рашучасьцю змагацца за лінію Камінтэрну.

Узросшы ў вялікую міжнародную камуністычную арганізацыю моладзі, пераўтварыўшы свой 10-гадовы вопыт барацьбы ў праграму, прынятую на сваім V-м кангрэсе, КІМ будзе такім-жа актыўным, такім-жа самаахвярна-адданым справе рэвалюцыі ў рэвалюцыйных бурах, якія набліжаюцца.

Мы пасылаем сваё гарачае бальшавіцкае прывітаньне міжнароднай арміі юных камунараў! Мы пасылаем сваё прывітаньне перадавому атраду гэтай арміі—нашаму Ленінскаму Камсамолу!

Праз межы, якія аддзяляюць нас ад братоў Захаду, праз строй фашысцкіх штыхоў, мы пасылаем прывітаньні рэвалюцыйнай салідарнасьці камсамолам Польшчы і Заходняй Беларусі!

У 10-гадовы юбілей КІМ'у працоўныя масы БССР разам з пматлікімі атрадамі маладых бальшавікоў усклікаюць: Няхай жыве Камуністычны Інтэрнацыянал і Камуністычны Інтэрнацыянал Моладзі! Няхай жыве Сусьветная Пралетарская Рэвалюцыя!

Сёньня, 20 лістапада
а 6-й гадзіне ўвечары ў клюбе Карла Маркса
АДБУДЗЕЦЦА
ПАСЯДЖЭНЬНЕ ФРАКЦЫІ КП(б)Б
2-й СЭСІІ ЦВК БССР
КП(б)Б праз'ыдуму ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Міністэрства рэкцыі і „левай" дэмагогіі*)

Прыход да ўлады ў Францыі міністэрства Тардзье мае значэньне ня толькі як паказальнік перамогі найбольш рэакцыйнага крыла французкае буржуазіі, але ў нейкім родзе і як паварот ны пункт у замежнай палітыцы Францыі. Перадачаю ўлады Тардзье, гэтаму найбольш характэрнаму прадстаўніку спэкулянцкіх элемэнтаў, бруднаму дзяльцу, скампрамэтаванаму ў цэлым радзе напоўкрымінальных авантур, буржуазія робіць як-бы апошнюю стаўку на сваё правае крыло і прабуе давесьці да лёгічнага канца барацьбу з рэвалюцыянізуючаўся рабочаю клясаю шляхам паліцэйскіх рэпрэсый. Тардзье павінен адыграць ролю «збаўцы грамадзтва», пусьціць у ход усе сродкі паліцэйскага арсэналу і не затрымлівацца нават перад парушэньнем буржуазнае законнасьці. Ён павінен зламаць наступленьне рабочае клясы, якою кіруе кампартыя, загнаць кампартыю ў падполье і падрыхтаваць пераход Францыі да вайскова-фашысцкага рэжыму.

У замежнай палітыцы на яго ўскладзены абавязак захаваць за Францыяй кіраўнічую ролю ў Эўропе, умацаваць саюз з усходня-эўрапэйскімі дзяржавамі, утрымаць Нямеччыну ў пасьлухмяньстве і, што асабліва важна, працягваць падрыхтоўку анты-савецкага паходу, захаваўшы ў гэтым сэнсе за Францыяю кіраўнічае значэньне. Усімі гэтымі задачамі зазначаецца характар і роля ўраду Тардзье, і адпаведна з імі Тардзье падабраў сабе супрацоўнікаў.

Зусім не выпадкова, што вайсковым міністрам назначаны Мажыно, асоба, скампрамэтаваная ня толькі ў палітычным, але і ў агульна-грамадзкім сэнсе. Мажыно ня раз выступаў супроць якіх-бы там ні было ўступак Нямеччыне і цяпер на пасту вайсковага міністра наперш загадаў, каб французкія гарнізоны не эвакуаваліся з Рэйнскае вобласьці. І гэта ня гледзячы на абяцаньні якія даў Брыян у Гаазе адносна таго, што калі Нямеччына прыме плян Юнга, дык эвакуацыя будзе праведзена да ліпеня 1930 году. Не дарма таксама Тардзье захаваў за сабою партфэль міністра ўнутраных спраў, які ён меў у міністэрствах Пуанкарэ і Брыяна. Гэта значыць, што «крыжовы паход», пачаты супроць камуністычнае партыі, будзе працягвацца з яшчэ большымі сіламі.

Радасьць рэакцыі, якая знайшла сваё выяўленьне ў прыходзе да ўлады міністэрства Тардзье, нікольки, аднак, не азначае, што французкая буржуазія адмовілася ад выкарыстоўваньня «левых мэтадаў» у кіраўніцтве дзяржавай. Калі-б сацыялістычная партыя пасьля адстаўкі міністэрства Брыяна ня спужалася канчаткова страціць папулярнасьць сярод рабочых і не адмовілася ад прыняцьця міністэрскіх партфэляў, якія ёй прапанаваў правадыр радыкалаў Даладзье, дык вельмі магчыма, што цяпер у Францыі існаваў-бы «левы» ўрад з радыкалаў і сацыялістых. І ў гэтым ня было-б ніякіх супярэчнасьцяй з сучасным курсам французкае буржуазіі, бо «левы манэўр» быў неабходны ёй пасьля адстаўкі Брыяна і можа быць неабходным у кожны момант, калі толькі пачне падымацца хваля незадаваленьня сярод шырокіх працоўных мас і трэба будзе знайсьці аддушыну для накапляючагася гневу народных мас.

Міністэрства Тардзье разлічае сумясьціць бесшабашную рэакцыю з дэмагагічнымі абяцаньнямі і рэпрэсыўнымі мерапрыемствамі. Вось, напрыклад, яно абяцае зьніжэньне падаткаў, адначасова робіць так, каб гэтае зьніжэньне пайшло на карысьць толькі буйному капіталу. Ён праектуе мноства буйных грамадзкіх работ, электрафікацыю, пабудову дарог і інш., але ўсё-ж большую частку асыгнаваных сум мае намер выкарыстаць на пабудову абарончае лініі на мяжы з Нямеччынай, на чым вельмі многа заробіць дастаўцы матар'ялаў. Сапраўдны сэнс гэтае дэмагогіі хутка стане ясным працоўным масам. Сялянства, якое патрабуе зьмены хлебных законаў, накіраваных цяпер на карысьць толькі буйных памешчыкаў і хлебных спэкулянтаў, надта хутка пераканаецца, што абяцаньні Тардзье, пры ўсёй іх дэмакратычнасьці, маюць на мэце менш за ўсё сялянскія інтарэсы. Мыльны пухір дэмагагічных абяцаньняў скора лопне і перад буржуазіяй стане пытаньне аб тым, як зьмякчыць незадаваленьне мас. У гэтым выпадку зноў стануць няўнікальным «левыя» камбінацыі і ня будзе нічога надзвычайнага ў тым, што зноў пачнуцца размовы пра «левае» міністэрства з удзелам сацыялістых. Да гэтага часу сацыялістыя ўжо патрафяць падрыхтавацца і пастараюцца знайсьці які-небудзь трук, каб падманудзь пралетараў, якія за імі ідуць.

Затрымаўшы эвакуацыю Рэйнскае вобласьці, міністэрства Тардзье вельмі хутка зразумела, што зрабіла памылку, бо, яго промах пасьпяшыла выкарыстаць Англія, якая шукае цяпер саюзьнікаў супроць Францыі. Таму ў апошнія дні мы бачылі, як патэнтаваны «міратворца» Брыян стараецца паправіць першыя хібы Тардзье. Ён зноў дае абяцаньні датэрмінова вывесьці французкія войскі, як толькі Нямеччына пакажа сваю гатоўнасьць выконваць плян Юнга. Брыян і найбольш далёка-бачная частка французкае буржуазіі разумеюць, што ў сучасны момант ім няма сэнсу сварыцца з Нямеччынаю, якая ім патрэбна для ажыцьцяўленьня іх палітыкі ва Усходняй Эўропе.

Аднэй з асноўных задач французкага імпэрыялізму зьяўляецца стварэньне антысавецкага блёку, Вадай усе зьвенні кольца, якое паводле думкі французкае дыплёматыі павінна абкружыць Савецкі Саюз, зьвязаны між сабою. Але для пасьпяховасьці задуманага анты-савецкага паходу неабходны хаця-б укосны ўдзел у ім Нямеччыны. Польшча ня можа спакойна прыняць удзел у вайне супроць СССР, калі ня будзе забясьпечанага тылу з боку Нямеччыны. У той-жа час Нямеччына павінна зьявіцца і транзітным шляхам з Францыі ў Польшчу і арсэналам для Польшчы. Цэлы рад рэакцыйных дзеячоў Францыі і Нямеччыны працуе над зьбліжэньнем паміж гэтымі двума краінамі, пры чым за гэтае зьбліжэньне Францыя абяцае дазволіць Нямеччыне павялічыць сваю армію і даламагчы ў пытаньні звароту калёній, а Нямеччына павінна заплаціць сваёю згодаю далучыцца да анты-савецкага блёку.

Калі міністэрства Тардзье не патрафіць задаволіць агульных інтарэсаў французкага імпэрыялізму, дык урад скора павінен будзе выйсьці ў адстаўку, з прычыны незадаваленьня самой-жа буржуазіі, і ўлада пяройдзе ў рукі больш гібкага Брыяна. Калі-ж буржуазія адчуе націсканьне з боку сялянства і гарадзкое дробнае буржуазіі і прымушана будзе ўзяць «левы» курс у адносінах да гэтых элемэнтаў, захоўваючы адначасова палітыку суровых рэпрэсый па адрасе рабочае клясы і кампартыі, дык яна павінна будзе заклікаць да ўлады радыкалаў і сацыялістых. Таму ў сваім сучасным выглядзе міністэрства буржуазнае рэакцыі доўга праіснаваць ня можа. Гэта толькі пераходнае міністэрства і гэтак на яго глядзіць і сама парляманцкая большасьць, якая падтрымлівае яго.

С. ЯВОРСКІ.

*) Артыкул напісаны спэцыяльна для «Зьвязды».

Радыёграмы

Значная перамога кампартыі на камунальных выбарах у Бэрліне

БЭРЛІН, 18. Камунальныя выборы у Бэрліне, у якіх прыняло ўдзел у сярэднім каля 70 проц. выбаршчыкаў, прынесьлі значную перамогу кампартыі і страту галасоў сацыял-дэмакратам. За кампартыю ва ўсіх акругах было падана 317 тысяч галасоў, у той час як за сацыял-дэмакратаў 306 тысяч галасоў.

На апошніх выбарах у рэйхстаг у 1927 годз

ПЛЕНУМ ЦК УсеКП(б)

Рэзалюцыя аб падрыхтоўцы тэхнічных кадраў

Даручыць ВСНГ СССР у бягучым годзе сумесна з УсеЦСПС і Наркамасьветы рэспублік арганізаваць у выглядзе вопыту адно-два прадпрыемствы-школу, у якой адбывалася-б падрыхтоўка кадраў (ніжэйшых, сярэдніх і вышэйшых) да сталай работы у вытворчасьці.

2. Даручыць ВСНГ прыняць меры да рашучага ўхіленьня элемэнтаў фармалізму і неарганізаванасьці ў правядзеньні бесьперапыннай вытворчай практыкі і забясьпечыць пасьпяховае яе правядзеньне . . . . . [1]).

3. Пашырыць сетку ВТНУ новага тыпу з рэзка вызначанай спэцыялізацыяй па пэўных галінах прамысловасьці, са скарочаным тэрмінам навучаньня (у 3 гады), устанавіўшы тэрмін для ўсіх іншых ВТНУ 4 гады навучаньня. У адпаведнасьці з гэтым павінны быць прадугледжаны навуковыя пляны і праграмы, пры чым неабходна рашуча зьнішчыць фармальна-мэханічны падыход да гэтай работы і праводзіць яе больш глыбока і сыстэматычна з тым, каб у 1930-31 г. магчыма было пачаць навуковы год па новай праграме. У прыватнасьці неабходна забясьпечыць у праграмах ВТНУ **канкрэтную эканоміку і марксыцкую гісторыю тэхнікі.** Адпаведна да новых праграм і навуковых плянаў забясьпечыць неперавыданьне падручнікаў.

4. ЦК лічыць патрэбным карэнным чынам палепшыць справу падрыхтоўкі эканамістых як для прамысловасьці, так і для гандлёвых, фінансавых, плянавых і статыстычных органаў; упарадкаваць сыстэму і напрамак эканамічных ВНУ, падаць адпаведным ВНУ, факультэтам, адданьленым пэўную мэтавую ўстаноўку ў сувязі з патрэбамі народнае гаспадаркі; перагледзець праграму і навучэбныя пляны прыстасоўна да мэтавай установкі тэй або іншай ВНУ, факультэту, адданьленьня. Даручыць спэцыяльна распрацаваць пытаньне аб забясьпячэньні эканамічных ВНУ як у адносінах іх абсталяваньня, так і нацыянальнага становішча студэнцтва і настаўнікаў. Лічыць, што ВСНГ, Наркамгандаль, Наркамфін, Дзяржплян, Цэнтрасаюз і ЦСУ павінны мацней зьвязацца з Наркамасьветы і з ВНУ для забясьпячэньня больш пасьпяховай падрыхтоўкі эканамістых і выкананьня прынятых пленумам ЦК настаноў.

5. Палепшыць якасна і пашырыць колькасна падрыхтоўку навукова-дасьледчых і пэдагагічных кадраў, у прыватнасьці, папаўняць пэдагагічныя кадры спэцыялістымі з вытворчасьці, якія аўладваюць патрэбнай тэарэтычнай падрыхтоўкай. Побач з рацыянальным выкарыстоўваньнем старых кадраў, больш энэргічна падрыхтоўваць і высоўваць маладыя навуковыя сілы, асабліва, з рабочых і партыйцаў. . . . . [1]).

Вылучыць і ўжо ў гэтым годзе са скончыўшых ВНТУ, рабочых і камуністых, ня менш 300 чал., для навукова-дасьледчай і пэдагагічнай работы, папярэдня падрыхтаваўшы іх спэцыяльна для гэтае мэты.

6. Адначаючы, што пастанова ліпеньскага пленуму аб выкарыстаньні замежнага вопыту выканана ў вельмі слабай ступені, ЦК прапануе, згодна з пастановаю ліпеньскага пленуму, павялічыць у бягучым годзе пасылку работнікаў за граніцу (**ня менш 500 чал.**).

Адначосова трэба больш рашуча прыцягваць на тэхнічна-гаспадарчыя і навукова-дасьледчыя работы выдатных заграніччных спэцыялістых, арганізаваць лепшае іх выкарыстоўваньне. Забясьпечыць на справе сыстэматычнае выпісваньне замежнай тэхнічнай літаратуры, арганізацыю лекцый замежных спэцыялістых, так і лекцый аб замежных дасьледах, якія чыталіся-б савецкімі спэцыялістымі, а таксама вывучэньне студэнтамі і маладымі спэцыялістымі чужаземных моў. Адначасова патрэбна сыстэматычнае забясьпячэньне ўсіх лябараторый ВНУ і ВНТУ належным заграніччным абсталяваньнем.

Пытаньні арганізацыі і кіраўніцтва ВТНУ

1. Канстатуючы, што перадача ВТНУ пад кіраўніцтва ВСНГ пошкодзіла сябе апраўдала, лічыць неабходным згуртаваньне пры ВСНГ новых будуючыхся індустрыяльных ВТНУ і тэхнікумаў, а таксама далейшую перадачу ўжо ў 1929-30 г. некалькіх ВТНУ для цяжкай індустрыі. Рашуча палепшыць работу «Главтузу», узмацніць яго работнікамі і ўскласьці на яго адказнасьць за ўвесь адміністрацыйна-гаспадарчы і навукова-пэдагагічны стан ВТНУ, якія перераданы пад яго кіраўніцтва.

Адначасова перадаць Наркамазему некалькі сельска-гаспадарчых вузаў. Разам з гэтым, палепшыць работу Наркамасьветы ў агульным кіраўніцтве вышэйшай асьветаю, а таксама ўзмацніць праграмна-мэтадычнае кіраўніцтва, у тым ліку і ВТНУ, пераданымі ВСНГ, НКПС і Наркамзему.

2. Прыняць рашучыя меры да зьліквідаваньня існуючых яшчэ да гэтага часу недахопаў ва ўнутранай арганізацыі ВТНУ; згуртаваць у кіраўніцтве ВТНУ усе адміністрацыйна-пэдагагічныя функцыі, вызваліўшы ад гэтага студэнцкія арганізацыі; партарганізацыі, ажыцьцяўляючы партыйны ўплыў і кіраўніцтва ў грамадска-палітычным жыцьці ВТНУ, не павінны мяшацца ў дэталі кіраўніцтва і непасрэдныя распараджэньні адміністрацыі . . . . . [1]). Адначасова стварыць пры ВТНУ працадзольныя саветы з прадстаўнікоў прафсаюзаў, с.-г. органаў, прафэсуры і студэнцтва.

3. ЦК прапануе партыйным арганізацыям узмацніць партыйную работу камуністых сярод новых кадраў, накіроўваючы іх да барацьбы з клясава-варожымі элемэнтамі. Неабходна рашуча палепшыць работу прафарганізацый, дабіцца рашучага паляпшэньня працоўнай дысцыпліны, эфэктнасьці вучобы . . . . . [1]). Адначасова неабходна рашуча ліквідаваць перагрузку студэнтаў, скараціўшы колькасьць сходаў, паседжаньняў па-за ВТНУ і разгрузіўшы студэнтаў ад лішніх грамадзкіх абавязкаў.

Працяг у наступным нумары

Арганізацыі КП(б)Б поўнасьцю ўхваляюць пастановы пленуму ЦК УсеКП(б) аб правёа апазыцыі

ПАРТЫЙНЫЯ МАСЫ ПАПЯРЭДЖВАЮЦЬ ПРАВЫХ АПАЗЫЦЫЯНЭРАЎ І ІХ ЛІДЭРАЎ, ШТО ДАЛЕЙШАЯ АБАРОНА І ПРАПАГАНДА ІМІ СВАІХ АНТЫЛЕНІНСКІХ ПОГЛЯДАЎ НЕСУМЯШЧАЛЬНЫ З ПРАБЫВАНЬНЕМ У РАДОХ УсеКП(б)

Накіроўваючы галоўны агонь па правым ухіле, узмацняючы барацьбу з правай апазыцыяй, партыя будзе весьці жорсткую барацьбу з „левымі" наскокамі на лінію партыі, з рэцыдывамі трацкізму

Узмацніць барацьбу з правай апазыцыяй

«Правда» прыводзіць за ўчарайшым нумары рад новых фактаў фракцыйнай барацьбы правых ухілістых супроць партыі і прапаганды імі анты-ленінскіх поглядаў бухарынскай правай апазыцыі.

Тактыка, якое прытрымліваліся лідэры правай апазыцыі (Бухарын, Рыкаў, Томскі) на пленуме ЦК УсеКП(б), яні толькі што адбыўся, дзе двурушніцкі было залулена нібы аб згодзе з генэральнай лініяй партыі і тут-жа ўзьвеў дзены пакпённіцкія абвінавачаньні супроць партыі і яе Ленінскага кіраўніцтва, знаходзіць, зразумела, сваё поўнае адлюстраваньне ў выступленьнях і фракцыйнай рабоце прадстаўнікоў бухарынскай школы.

«Правда» зьмяшчае карэспандэнцыі аб выступленьні ў Варонежы вучня і пасьлядоўніка Бухарына САПОЖНІКАВА, які не камсамольскім сходзе Варонескага унівэрсытэту прабавуў дзевесьці, што Бухарын нікопі правым ня быў, што ён не ідэолёг правай апазыцыі.

Сапожнікаў перапеў усе ісьціны, якія «изрекали» Сьляпкоў, Айхэнвальд і іншыя.

Сход зусім правільна ацаніў выступленьне Сапожнікава, як новую замаскаваную вылазку правай апазыцыі.

Правы ўхілісты А. Мацьвеоў выступіў на партсходзе Тормазнага заводу ў Масіве з паўторнай заявай, што ён за лінію партыі, але... ён лічыць няправільным абвінавачаньне Бухарына ў правым ухіле, што ні ён, ні яго пасьлядоўцы ніколі ня былі правымі ўхілістымі, і г. д. Сход ячэйкі належным чынам ацаніў гэта двурушніцкае выступленьне прадстаўніка правай апазыцыі.

«Правда», зьмясьціўшы гэтыя карэспандэнцыі ў артыкуле пад загалоўкам «МАЦНЕР АГОНЬ НАПРАВА», піша:

«За апошні год партыя шмат зрабіла для выкрыцьця анты-ленінскай, антыбальшавіцкай сутнасьці правага ўхілу. Але барацьбу з ім нельга паспаляць ні на адну хвіліну. Гэта асабліва шкодна рабіць у той момант, калі правыя, настойваючы на сваіх памылках, прабуюць хітрыць, віляць, круціць: з аднаго боку нельга, моў, ня прызнацца, што генэральная лінія правільная, але з другога боку нельга не сазнацца, што наша крытыка гэтай лініі была правільнай. Асобныя прыхільнікі Бухарына гатовы нават прызнаць, што ў 1925 годзе Бухарын рабіў памылкі, але аб сённешняй пазыцыі Бухарына якая цалкам выцякае з памылак Бухарына 1925 г. гэтыя «крытычныя» прыцэлі Бухарына замоўчваюць. Правыя апартуністыя пачынаюць хлусіць. Партыя паўтора раз на заўсёды паляжыць канец двурушніцкай і двуліцай гульні правых. Калі ўся гэта ліберальная шкодна маладых прафэсароў (Сьляпкоў, Сапожнікаў, Марэцкан, Айхэнвальд і інш.) поўнасьцю і да канца не адмовіцца ад сваіх правых апартуністычных поглядаў, то яна паставіць сябе па-за радамі партыі.

АБАРОНА АНТЫ-ЛЕНІНСКІХ ПОГЛЯДАЎ ПРАВАЙ АПАЗЫЦЫІ НЕСУМЯШЧАЛЬНА З НАЛЕЖНАСЬЦЮ ДА БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫІ

Арганізацыі і ячэйкі КП(б)Б у сваіх рэзалюцыях патрабуюць самага суровага пакараньня правых ухілістых, якія ўступілі на шлях фракцыйнасьці.

Партыйныя масы з непасьлабнай увагай сочаць за паводзінамі правых.

Партыя не дапусьціць хаця-б найменшага паспаляньня жалезнай дысцыпліны яе ленінскіх радоў.

Барацьбу супроць правых капітулянтаў, якія абанкруціліся, партыя давядзе да канца.

Узмацняючы барацьбу з правай апазыцыяй, партыя будзе неаспабна змагацца і супроць усякіх «левых» наскокаў на лінію партыі.

Адабраем вывад тав. Бухарына са складу Палітбюро

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ

Заслухаўшы паведамленьне аб пастановах апошняга пленуму ЦК УсеКП(б) па пытаньні аб групе правых ухілістых на чале з т. Бухарыным, бюро ЦК ЛКСМБ канстатуе, што правы ўхіл, які аформіўся ў пэўную сыстэму поглядаў, што ў корані адрозьніваюцца ад генэральнай лініі партыі, і, ня гледзячы на частыя папярэджаньні правай апазыцыі з боку партыі аб спыненьні барацьбы супроць партыі, апошнія (правыя ўхілістыя) ня толькі не адмовіліся ад сваіх шкодных права-апартуністычных поглядаў, а яшчэ больш узмацнілі барацьбу супроць партыі (выступленьне Сьляпкова, Мацьвеева, Айхэнвальда, Зайцава, і інш.) і, нарэшце, паводзіны т.т. Бухарына, Томскага і Рыкава на апошнім пленуме ЦК УсеКП(б), якія занялі двурушніцкую пазыцыю і крыгадушна заявілі аб сваёй згодзе з лініяй партыі, не адмовіўшыся ад сваіх ранейшых абвінавачаньняў супроць партыі (ваенна-фэадальная эксплёатацыя сялянства, скочваньне да ваеннага камунізму і інш.), нават дадалі новыя хлусьлівыя абвінавачаньні партыі. Гэты двурушніцкі манэўр правай апазыцыі ня можа расцэньвацца, як спроба часова адступіць ад таго, каб пры першых труднасьцях зноў атакаваць партыю.

Бюро ЦК ЛКСМБ цалкам далучаецца і вітае пастанову пленуму ЦК УсеКП(б) аб выводзе лідэра правай апазыцыі т. Бухарына з палітбюро і папярэджаньне другіх правых ухілістых (Рыкаў, Томскі і інш.), таксама і пастанову пленуму ЦК аб тым, што прапаганда поглядаў правай апазыцыі і прымірэнцтва да іх несумяшчальна з прыналежнасьцю да УсеКП(б).

Бюро ЦК заклікае ўсю камсамолію Беларусі да яшчэ большага згуртаваньня сваіх радоў наўкола партыі і Ленінскага ЦК, да глыбокага вывучэньня і прапрацоўкі пастаноў пленуму ЦК УсеКП(б), да яшчэ больш узмоцненай барацьбы супроць усякіх ухілаў ад лініі партыі і асабліва супроць правага ўхілу і прымірэнцтва, не паслабляючы барацьбы супроць «левых загібаў».

Няхай жыве Ленінскі ЦК УсеКП(б)!

За жалезную бальшавіцкую дысцыпліну!

У адказ на вылазкі правых банкрутаў мабілізуем усе свае сілы на будаўніцтва сацыялізму

Агульны адкрыты сход ячэйкі КП(б)Б гуты «ПРАЛЕТАРЫ» цалкам і поўнасьцю далучаецца да пастаноў пленуму аб правай апазыцыі і лічыць зусім правільным вывад ідэолёга правага ўхілу т. Бухарына са складу палітбюро і папярэджаньне ТОМСКАМУ і РЫКАВУ.

Сход запэўняе ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, што найменшыя спробы правых апазыцыянэраў працягваць сваю фракцыйную дзейнасьць супроць лініі партыі і Камінтэрну спаткаюць з нашага боку самы рашучы і бязьлітасны адпор.

Мы ў адказ на вылазкі правых апазыцыянэраў яшчэ больш мабілізуем свае сілы на будаўніцтва сацыялізму, яшчэ больш узмоцнім вярбоўку ў рады партыі новых пралетарскіх кадраў, лепшых рабочых і работніц ад варштату.

Партколектыў Эльводу вітае бальшавіцкія пастановы пленуму ЦК УсеКП(б)

Партыйны калектыў **Эльводу** (Менск) канстатуе, што вынікі першага году пяцігодкі дашчэнту абверглі капітулянцкія «тэорыі» правых апартуністых.

Дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва, шпаркі тэмп індустрыялізацыі нашай краіны і магутны рост калектывізацыі сельскай гаспадаркі яшчэ раз пацьвердзілі правільнасьць генэральнай лініі партыі.

Ня гледзячы на гэта, правыя ўхілістыя працягваюць настойваць на сваіх памылковых поглядах, скочваючыся па шлях фракцыйнай барацьбы супроць лініі партыі і Камінтэрну.

Камунары Эльводу цалкам і поўнасьцю далучаюцца да пастановы пленуму ЦК УсеКП(б) аб выводзе ідэолёга і тэарэтыка правага апартунізму тав. **Бухарына** са складу палітбюро і ўхваляюць папярэджаньне т.т. **Томскаму і Рыкаву**, якое зроблена пленумам ЦК УсеКП(б).

Сход лічыць, што ў пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі Савецкага Саюзу і разгорнутага наступленьня на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, фракцыйная дзейнасьць правых ухілістых узмацняе пазыцыі буржуазіі і перашкаджае выразнаму правядзеньню генэральнай лініі партыі.

Таму партколектыў Эльводу патрабуе прыняцьця самых рашучых энэргічных мер да правых фракцыянэраў аж да выключэньня іх з радоў партыі.

На вылазкі правых ухілістых ячэйка КП(б)Б Эльводу адказвае яшчэ больным узьняцьцем працоўнай дысцыпліны і ўзмацненьнем сацыялістычнага будаўніцтва, яшчэ большым разгортваньнем самакрытыкі і мабілізацыяй сіл на выкананьне пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва.

Цалкам ухваляем пастановы пленуму

Рэзалюцыя бюро Кастрычніцкага РК КП(б)Б

Заслухаўшы інфармацыю тав. КОНЮХАВА аб пастановах апошняга пленуму ЦК УсеКП(б), бюро Кастрычніцкага райкому КП(б)Б цалкам і поўнасьцю далучаецца да ўсіх пастаноў пленуму.

— Бюро РК ухваляе пастанову пленуму ЦК УсеКП(б) аб выводзе са складу Палітбюро ідэолёга і тэарэтыка правага ўхілу т. Бухарына і апошняе папярэджаньне Рыкаву і Томскаму.

Бюро раённага камітэту заклікае ўсю партыйную арганізацыю з усёй рашучасьцю і надалей змагацца з права-апартуністычнымі поглядамі і прапагандай іх тэорыі і практыкі, а таксама фракцыйнай барацьбой супроць лініі партыі.

Бюро РК КП(б)Б заяўляе, што найменшыя спробы весьці прапаганду антыпартыйных поглядаў, фракцыйнай барацьбы з боку права-ўхілістых супроць партыі паставяць іх па-за радамі партыі, бо такая лінія несумяшчальна з прабываньнем у партыі.

ПАД СТАЛЁВЫМ КІРАЎНІЦТВАМ ЛЕНІНСКАГА ЦК УсеКП(б) УПЕРАД ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ АДЗІНСТВА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ!

Бальшавікі „Чырвонай Бярэзіны" патрабуюць спыненьня антыпартыйнай дзейнасьці правых апазыцыянэраў

Партарганізацыя фабрыкі **«Чырвоная Бярэзіна»**, заслухаўшы даклад т. **Вайнэровіча** аб унутрыпартыйным становішчы і апошніх фракцыйных вылазках правых ухілістых, канстатуе, што:

Дасягненьні першага году пяцігодкі поўнасьцю абвяргаюць капітулянцкія тэорыі ныцікаў і малавераў з правага лягеру і выразна пацьвярджаюць правільнасьць генэральнай лініі партыі.

Індустрыялізацыя нашай краіны, магутны рост калгасаў і саўгасаў — усе гэтыя відавочныя вялікія посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі зьяўляюцца вынікам цьвёрдага і няўхільнага ажыцьцяўленьня лініі партыі.

На прыкладзе нашай фабрыкі зусім відавочна памылковасьць поглядаў правых апартуністых, якія прапагандуюць свае тэорыі аб непасільнасьці тэмпаў індустрыялізацыі, аб нерэальнасьці пяцігадовага пляну і г. д. Расьце і мацнее наша фабрыка. У першым годзе пяцігодкі вытворчая праграма выканана на ўсе 100 проц. Поўнасьцю ажыцьцёўлена дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі. З кожным днём расьце лік ударных брыгад на прадпрыемстве і ўсё шырэй і шырэй разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва.

Ня гледзячы на гіганцкія дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне, правыя капітулянты ня спыняюць сваёй фракцыйнай барацьбы супроць лініі партыі і Камінтэрну.

Сход патрабуе ад групы т. Бухарына поўнага прызнаньня сваіх памылак. Партарганізацыя «Чырвонай Бярэзіны» патрабуе рашучай і канчатковай ліквідацыі фракцыйнай барацьбы супроць лініі партыі і Камуністычнага Інтэрнацыяналу, якую (барацьбу) ня спыняюць правыя фракцыянэры.

За жалезную дысцыпліну партыйных радоў.

Бальшавіцкае прывітаньне Ленінскаму ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б!

Не дазволім тармазіць сацыялістычнае будаўніцтва

Заслухаўшы інфармацыю аб пастановах апошняга пленуму ЦК УсеКП(б), партыйны калектыў чырвонаштандартнага заводу «БАЛЬШАВІК» цалкам і поўнасьцю ўхваляе пастанову пленуму аб выводзе лідэра правай апазыцыі Бухарына са складу палітбюро і аб папярэджаньні т.т. Томскаму і Рыкаву.

У выпадку парушэньня пастаноў апошняга пленуму ЦК УсеКП(б) мы патрабуем ужыць далейшыя арганізацыйныя меры.

Парткалектыў чырвонаштандартнага заводу «Бальшавік» запэўняе Ленінскі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б у тым, што камуністы «Бальшавіка» будуць і надалей яшчэ больш рашуча і бязьлітасна змагацца з усялякімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі.

Няхай жыве Ленінскі ЦК і яго правадыр т. Сталін!

КАМУНІСТЫЯ-ЧЫГУНАЧНІКІ УХВАЛЯЮЦЬ ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМУ

Заслухаўшы інфармацыю тав. Русецкага аб апошніх пастановах пленуму ЦК УсеКП(б), ячэйка КП(б)Б вагонных майстэрань станцыі Менск цалкам і поўнасьцю далучаецца да гэтых пастаноў і лічыць зусім правільным вывад лідэра правай апазыцыі т. Бухарына са складу палітбюро і папярэджаньне т.т. Томскаму і Рыкаву.

Сход запэўняе бальшавіцкі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б у сваёй поўнай гатоўнасьці яшчэ больш упарта і рашуча змагацца за Ленінскую лінію партыі супроць правых капітулянтаў і прымірэнцаў, не паслабляючы адначасова барацьбы з «левымі» загібамі і настроямі.

Няхай жыве бальшавіцкі ЦК!

Ячэйка хэмічнага факультэту аб пастановах пленуму

Заслухаўшы інфармацыю т. **Мар'янава** аб пастановах пленуму ЦК УсеКП(б) наконт правай апазыцыі, агульны сход партыйнай ячэйкі **хэмічнага факультэту** цалкам і поўнасьцю далучаецца да пастаноў пленуму і лічыць зусім правільным вывад ідэолёга правага ўхілу т. **Бухарына** са складу палітбюро і папярэджаньне, зроблепае рэшце лідэраў правай апазыцыі **(Рыкаву і Томскаму).**

Парт'ячэйка хэмічнага факультэту ў далейшым яшчэ больш узмоцніць самую рашучую бязьлітасную барацьбу з усялякімі ўхіламі ад Ленінскай лініі партыі, мабілізуючы ўсе свае сілы на барацьбу супроць галоўнай небясьпекі на даным этапе — правага ўхілу і прымірэнцтва да яго, не паслабляючы адначасова барацьбы супроць «левых» заскокаў і настрояў. Толькі дзякуючы Ленінскаму кіраўніцтву ЦК мы дабіліся вялізарных посьпехаў у будаўніцтвае сацыялізму ў нашай краіне.

Няхай жыве бальшавіцкі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б!

ПАТРАБУЕМ ПОЎНАГА ПРЫЗНАНЬНЯ ПАМЫЛАК

Заслухаўшы інфармацыю аб пастановах апошняга пленуму ЦК УсеКП(б) наконт групы правых ухілістых, агульны сход ячэйкі КП(б)Б **праўгасу БДУ** цалкам і поўнасьцю далучаецца да пастановы пленуму аб выводзе т. Бухарына са складу палітбюро, а таксама ўхваляе папярэджаньне т.т. Рыкаву і Томскаму.

Сход асуджае дзейнасьць правай апазыцыі, якая накіравана супроць генэральнай лініі партыі.

Сход патрабуе ад правых ухілістых рашучага і поўнага прызнаньня сваіх апартуністычных памылак. У адваротным выпадку сход патрабуе ад ЦК ужыць энэргічныя арганізацыйныя меры да ўсіх тых, хто як у тэорыі, так і ў практыцы будзе праводзіць антыпартыйныя погляды правых ухілістых і ня спыніць фракцыйнай барацьбы супроць лініі партыі.

Няхай жыве адзінства радоў бальшавіцкай партыі!

Крызіс фашысцкай дыктатуры ў Польшчы*)

Падзеі ў Польшчы, гэтым найбольш слабым і нятрывалым зьвяне імпэрыялістычнай стабілізацыі, сьведчаць аб тым, што крызісны стан фашысцкай дыктатуры ў Польшчы, як вынік абвастрэньня ўнутраных супярэчнасьцей адносная капіталістычнай стабілізацыі і нарастаньня рэвалюцыйнага ўздыму мас, няміцна пераходзіць у востры крызіс фашысцкай сыстэмы.

Шпарка нарастаюць элемэнты рэвалюцыйнай сытуацыі. Увесь ход падзей у Польшчы сьцьвярджае правільнасьць аналізу і ацэнкі, дадзеных X пленумам ВККІ, а таксама XI пленумам ЦК КПП, які канкрэтызаваў агульна-камінтэрнаўскія ўстаноўкі да ўмоў фашысцкай Польшчы. Ход і напрамак сацыяльна - эканамічных працэсаў у нас на ЗБ з свайго боку сьцьвярджае цалкам і поўнасьцю правільнасьць ацэнак, дадзеных VI пленумам ЦК КПП.

У цяперашні час нават міністры правадыра фашысцкай дыктатуры — Пілсудзкага, — хоць у вельмі туманных і напышлівых фармулёўках, канстатуюць ня толькі глыбіню і ўпартасьць эканамічнага крызісу, але і яго далейшага агульнага абвастрэньня. Вядомы ў фашысцкім лягеры знаўца і тэаратык польскага фашызму — міністар фінансаў — Матушэўскі, прымушаны ў гаршку казённага антымізму падносіць сваім гаспадаром вельмі горкі напой: «здаецца — кажа ён, — найбольшы спад крывой крызісу ўжо як-бы зваду»... Аднак «нельга быць цалкам перакананым, што палепшаньне наогул мела месца».

Бязумоўна, ні аб якім палепшаньні мовы быць ня можа. Маюць месца **частковыя хістаньні** ў бок пекаторага зьмякчэньня крызісу ў **паасобных** галінах гаспадарчага жыцьця. Гэтыя хістаньні маюць пачатак, у першую чаргу, у ваеннай прамысловасьці, **якая працуе шалёным і ўсё больш напружаным тэмпам.** Аднак узрост вытворчага напружаньня ў ваеннай прамысловасьці зьяўляецца адначасна адзэй з крыніц **абвастрэньня агульнага крызісу.** Нязначнае ажыўленьне можна заўважыць яшчэ і ў вугальнай прамысловасьці Польшчы. Яно выклікаецца, з аднаго боку, палітыкай фашысцкага ўраду, які стымулюе экспарт шляхам бросавых цэнаў (дэмпінг), а другога боку, сэзоннымі момантамі (загатоўка вугалю на зіму).

Побач з гэтымі хістаньнямі неабходна адзначыць, што мэталюргічная прамысловасьць за апошнія месяцы моцна вышэй шалёны тэмп работы ваеннай прамысловасьці. Дзеля гэтага неабвяргальным фактам зьяўляецца **далейшае агульнае заваострэньне эканамічнага крызісу ў фашысцкай Польшчы.**

У Зах. Беларусі агульна-польскі эканамічны крызіс, як гэта правідлова падкрэсьліў III пленум ЦК КПЗБ, выяўляецца ў асабліва вострых формах, як вынік акупацкай палітыкі фашысцкага ўраду. Эканамічны крызіс у Зах. Беларусі, які і ў Польшчы найбольш востра б'е па тэкстыльнай, дрэваапрацоўчай і гарбарскай прамысловасьці. Голад, які зьяўляецца вынікам абшарніцка - кулацкай аграрнай і падатковай палітыкі фашысцкага ўраду, руйнуе, вось ужо ўсьцяж 6 гадоў, вёску Зах. Беларусі і пагражае гэтай зімой і вясной зьнішчыць новыя тысячы беднякоў і сераднякоў. Голад паглыбляе эканамічны крызіс у Зах. Беларусі і прыдае яму яшчэ больш агульны і глыбокі характар. Руйнаваньне асноўных бяднацкіх і серадняцкіх мас вёскі —жорстка б'е на местачковым саматужніку — і дробнай прамысловасьці, якая зьяўляецца дамінуючай во ўмовах ЗБ.

Фашысцкі ўрад разглядвае ЗБ, як пляцдарм будучага наступленьня супроць СССР, будуе фартыфікацыі, шасейныя дарогі і чыгункі, мэханічныя хлебазаводы, ужываючы ў гэтым будаўніцтве у самых шырокіх разьмерах прымусовую бясплатную працу насельніцтва ў форме шарварак, гмінных павіннасьцяй. Гэтыя шарваркі вядуць да далейшага руйнаваньня насельніцтва, скарачаюць яго пакупецкую здольнасьць і прыводзяць да заваострэньня эканамічнага крызісу ў ЗБ.

З эканамічнага крызісу буржуазія і абшарнікі шукаюць выхад шляхам узмацненьня эксплёатацыі працоўных мас пад аховай фашысцкай дыктатуры і з дапамогай сацыял-фашызму. На працоўныя масы вядзецца буржуазіяй фашысцкай дыктатурай і сацыял-фашыстымі канцэнтраваная атака. Паніжаюць галодную заработкоўю плату, павялічваюць рабочы дзень, павышаюць інтэнсіўнасьць эксплёатацыі працы рабочых, шарабкоў і сэзоннікаў шляхам усялякага роду прошукаў, якія ідуць пад сьцягам капіталістычнай рацыналізацыі. У выніку эканамічнага крызісу прадпрыемстваў, маючых на мэце затрымаць разьвіцьцё крызісу, расьце ў пагражаючых разьмерах беспрацоўе.

Адпэй з форм атакі пануючых клясаў на працоўныя масы зьяўляецца разгортваньне сыстэмы фашысцкага законадаўства, як аб вучнёўстве, аб працоўных судох і арбітражы. Побач з фашысцкім законадаўствам урад супольна з сацыял-фашыстымі — разграмляе рабочы і рэвалюцыйны рух шляхам ужываньня самых вышуканых мэтадаў палітычнага і эканамічнага тэрору. Забойства з-за вугла рабочых і сялянскіх дзеячоў, якія да гэтага часу мелі месца ў большасьці выпадкаў на «Усходніх крэсах», цяпер у шырокіх разьмерах практыкуецца і ў каранной Польшчы (забойства ў Лодзі т. Гэрмана, удзельніка польскай рабоча-сялянскай дэлегацыі ў СССР).

Апрача гэтых мер, фашысцкі ўрад выконвае плян сваіх гаспадароў з Левіятана і саюзу буйных землеўласьнікаў, праводзіць цэлы рад мерапрыемстваў эканамічнага парадку, якія маюць на мэце ўзбагачаць пануючыя клясы. Пасьля адмены 10-процантнага дабаўленьня да падаткаў на капітал, фашысцкі ўрад завёў выгадную абшарнікам і кулаком мытную ахову сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама свабодны вываз хлеба за мяжу. Абшарнікам і кулаком дадзены цэлы рад падатковых ільгот. Усе гэтыя мерапрыемствы прыводзяць да росту дарагоўлі і заваострэньня падатковых цяжараў у адносінах да шырокіх працоўных і эксплёатаваных мас.

У выніку крызісу і тых мерапрыемстваў, якія фашысцкі ўрад ужывае, каб перамагчы крызіс, завастраецца клясавая барацьба ў краі. Працоўныя і эксплёатаваныя масы ўсё шырэй і больш часта пераходзяць у наступленьне супроць капіталізму. У сучасны момант мы маем ужо ня толькі перарастаньне эканамічных баёў у палітычныя, ня толькі рост контр-наступальных тэндэнцый у баёх рабочае клясы супроць капіталізму і ў баёх рэвалюцыйнага сялянства супроць абшарнікаў, але месцамі і адкрытыя бунты супроць фашысцкай сыстэмы. У цэлым радзе прамысловых цэнтраў рэпутуюцца масавыя забастоўкі рабочых, наперакор сацыял-фашыстым. У Тэрасполі ў часе правядзеньня камасацыі мела месца крывавая сутычка сялян з паліцыяй. У Віленшчыне сяяне сарвалі гроблю і замас і пераходзе іх у контр-наступленьне на ўсім фронце, сьведчыць таксама, настрой у арміі і асобныя рэвалюцыйныя выступленьні салдат. Выбарчыя кампаніі ў органы самаўраду былі таксама яскравым прыкладам паляпшэньня настрояў мас і завастрэньня клясавай разьмежаванасьці.

Усе гэтыя працэсы знаходзяць адбіцьцё ў настроях нізавой масы, якая знаходзіцца пад непасрэдным палітычным і арганізацыйным уплывам сацыял-фашызму. У зьвязку з гэтым неабходна падкрэсьліць характар дэманстрацыі ТУР'аўцаў у часе сацыял-зголіцкага юнацкага дня, а таксама паход пэпэсаўскай дэманстрацыі каля сьцен цытадэлі на могілкі забітых рэвалюцыянэраў. У абодвух выпадках у сапраўднасьці выявілася палітычнае банкрутства сацыял-фашызму.

Усё ясьней становіцца, што ў Польшчы і на ЗБ на фоне ўсё разгортваючагася і паглыбляючагася эканамічнага крызісу ідзе працэс **нарастаньня элемэнту рэвалюцыйнай сытуацыі.** Усё ясьней становіцца той факт, што і **«нізы ня хочуць»** старога — а «вярхі» ня могуць жыць і кіраваць па-старому» (Ленін).

У фашысцкім лягеры ідзе працэс расколу. Вонкавым выяўленьнем гэтага працэсу зьяўляецца ўсё завастрачаеся цярпёж паміж кіруючай групай пілсудчыкаў і другімі складовымі часткамі фашысцкага лягеру. Зразумела, цярпёж між фашысцкім штабам і партыямі т. н. «левай» апазыцыі, якая канцэнтруецца каля ППС і ўсё больш зрастаецца з фашысцкай сыстэмай, гэтае цярпёж выяўляецца толькі ў разнагалосіцы ў мэтадах барацьбы за стабілізацыю фашысцкай дыктатуры ў Польшчы. Гэтыя партыі зьяўляліся і зьяўляюцца прывадзнымі рамянямі фашысцкай дыктатуры ў адносінах да працоўных мас. Яны завастраюць дэмагагічную апазыцыйную фразэалёгію, каб ня страціць кантакту з усё больш рэвалюцыянізуючымися масамі і адцягнуць іх ад барацьбы. Аб гэтым красамоўна сьведчаць таямныя нарагаворы паміж Дашынскім і Пілсудзкім аб супрацоўніцтве апазыцыйных партый з урадам на грунце сойму.

У зьвязку з завастрэньнем гаспадарчага крызісу, паражэньнем фашысцкай палітыкі ва ўсіх галінах, бушаваньнем пралетарыяту, а таксама асноўных мас сялянства і паняволеных народаў, разьвяротам і адначасна разам са звужэньнем палітычнай базы фашызму расьце ўплыў кампартыі. Каб перакінуць рэвалюцыйныя настроі на рэйкі фашызму, каб стварыць кляпан бясьпечнасьці для фашысцкай дыктатуры, правадыры ППС прымушаны маневраваць і заяўляць масам, што Пілсудзкі «стаў» чалавекам рэакцыі, але што грунт легальнасьці ім яшчэ не натыя і іх набратымцы з народніцка-фашысцкіх сялянскіх партый вядуць слоўныя баі ў абарону сакавіцкай канстытуцыі і дэмакратыі. Увесь гэты шум і гам зьяўляецца толькі контр-рэвалюцыйнай дымавэсьсяй з боку гэтых партый у абарону фашысцкай дыктатуры. Аб гэтым лепш усяго сьведчыць чулае адзінства пэпэсаўцаў з эндэкамі. Маму сьведчаць аб тым, што фашысцкая дыктатура ідзе па шляху далейшага заваострэньня фашысцкай сыстэмы, далейшага ўзмацненьня прыгнечаньня мас і для мабілізацыі мас, да разгортваньня ваеннай кампаніі супроць СССР.

У зьвязку з агульным крызісам фашысцкай дыктатуры і нарастаньнем элемэнтаў рэвалюцыйнай сытуацыі, усё большае і большае значэньне набірае падрыхтоўка ваеннага нападу на СССР. Вайна ўсё больш становіцца адзіным выхад

Легэнда аб „арганізаваным капіталізьме“*)

Л. Эвэнтох

Тэорыя «арганізаванага капіталізму», якая зьяўляецца важнейшай сустаўнай часткай канцэпцыі Бухарына аб імпэрыялізьме і процінастаўленай ім тэорыі Леніна аб імпэрыялізьме, як аб манапалістычным капіталізьме, прадстаўляе сабой рад такіх палажэньняў і адкрыцьцяў, якія ня могуць ня прывесьці да буйных палітычных памылак і хістаньняў. З другога боку, гэта тэорыя, якая прэтэндуе адлюстраваць апошні этап капіталізму, дае скажонае прадстаўленьне аб сапраўдных працэсах, што адбываюцца пад буржуазнай абалонкай і, натуральна, можа затрудніць рэвалюцыйную барацьбу рабочае клясы.

Асноўныя элемэнты гэтай тэорыі могуць быць зьведзены да наступных нешматлікіх палажэньняў:

Першае палажэньне. Па аналёгіі з устаноўленай Марксам і Энгельсам супярэчнасьцю паміж арганізацыяй вытворчасьці на асобнай фабрыцы і анархіяй вытворчасьці ўнутры капіталістычнага грамадзтва цалкам, т. Бухарын, выходзячы з росту нацыянальных манапалістычных аб'яднаньняў і рэгулюючага ўмяшаньня буржуазных дзяржаў у гаспадарчае жыцьцё, канстатуе супярэчнасьць паміж «арганізаваным і ўнутрана ўрэгуляваным нацыянальным капіталізмам», з аднаго боку, і неўрэгуляванай, сусьветнай гаспадаркай, якая разьвіваецца канкурэнцыяй і ідзе да войнаў—з другога боку. У «Экономике переходного периода» (стар. 10) т. Бухарын проста заяўляе: «Фінансавы капітал зьнішчыў анархію вытворчасьці ўнутры буйна-капіталістычных краін». Гэта палажэньне т. Бухарын паўтарае ўсякі раз, калі пачынае гаварыць аб імпэрыялізьме, аж да апошніх яго артыкулаў у «Правде». З апошніх мы адзначым паступнае характэрнае месца. Ён піша:

«Яе (г. зн. сучаснае капіталістычнае гаспадаркі) анархічная прырода перапаўзае на асноўныя лініі міжнародна-гаспадарчых адносін. Праблемы рынку, цэн, канкурэнцыі, крызісаў становяцца ўсё больш праблемамі сусьветнае гаспадаркі, замяняючыся ўнутры «краіны» праблемай «арганізацыі». («Тэорыя арганізаванай безгаспадарчасьці», «Правда» 30-га чэрвеня 1929 году. Курсыў т. Бухарына).

Пры гэтым тав. Бухарын так «перапаўзае» на «лінію» «арганізаванага капіталізму», што яго ўжо не здавальняе палавіннасьць буржуазнага эканамістага Бэнтэ ў гэтым пытаньні. «У адным месцы, працягвае т. Бухарын, Бэнтэ гаворыць, што канкурэнцыя ўсё-ж застаецца паміж галінамі вытворчасьці. А вэртыкальная канцэнтрацыя?—асаджвае яго т. Бухарын. А камбінаты? І дзе сапраўды застаецца галоўным чынам канкурэнцыя?» І пасьля гэтага допыту з аднабокасьцю сьцьвердзе: «... Яна разгортваецца з асобнай сілай на сусьветным рынку. Але канкурэнцыя на сусьветным рынку ёсьць вайна». (Там-жа, курсыў т. Бухарына).

Другі элемэнт тэорыі «арганізаванага капіталізму» зводзіцца да пасгуппага. З адміраньнем канкурэнцыі ўнутры асобнай капіталістычнай краіны, замест стыхійнага рэгулятара вытворчасьці, становіцца сьвядомы кантроль капіталістычнае клясы, рынкавая сувязь замяняецца арганізаванай сувязьзю, грамадзкі падзел працы—тэхнічным падзелам працы. Тав. Бухарын прычэпвае капіталістычную рэчаіснасьць пад сваю надуманую схэму і піша ў тай-жа «Экономике переходного периода»: «Капіталістычная народная гаспадарка абярнулася з ірацыянальнай сыстэмы ў рацыянальную арганізацыю, з бяссуб'ектыўнае гаспадаркі ў гаспадарчы суб'ект» (стар. 14, курсыў т. Бухарына).

З папярэдніх пасылак, нарэшце, выцякае і трэцяе палажэньне. Рацыянальная грамадзкая сыстэма, у якой зьнішчана канкурэнцыя і анархія вытворчасьці, зьяўляецца плянавай сыстэмай, якая кладзе канец пэрыядычным крызісам. Гэта—па схэме т. Бухарына, «калектыўна-капіталістычны лад (дзяржкапіталізм), дзе, значыцца, перад намі арганізаваная, але ў тойжа час антаганістычная, з пункту погляду кляс, гаспадарка» («Імпэрыялізм і накапленьне капіталу», стар. 83, курсыў т. Бухарына). Тут,—заяўляе тав. Бухарын,—ня можа атрымацца ніякага крызісу перавытворчасьці, тут могуць быць толькі асобныя пралікі ў плянавым парадку.

Каб унікнуць непаразуменьняў, мы павінны адзначыць, што абмаляваны «калектыўна-капіталістычны лад» разглядаецца ў цытаваным месцы аўтарам, як гіпотэза, але гэта гіпотэза аднаўляе ўсе рысы «арганізаванага капіталізму» так, як яны малюцца т. Бухарыну. І каб ня было ніякіх сумненьняў, ён крыху далей піша: «Сучасныя капіталістычныя дзяржавы ёсьць эканамічна-вялізарныя камбінаваныя трэсты» (стар. 119). І далей яшчэ больш пэўна...

«... Усе супярэчнасьці капіталістычнай сыстэмы... можна фармуляваць... як супярэчнасьць паміж прадукцыйнымі сіламі сусьветнай гаспадаркі і «нацыянальна» абмежаванымі мэтадамі прысваеньня з боку даяржаўна-разгароджанае буржуазіі; або як супярэчнасьць паміж аграмаджанай у найшырэйшым маштабе вытворчасьці і прыватна гаспадарчымі, або «нацыянальна»-буржуазна-гаспадарчымі маемаснымі адносінамі» (Стар. 131, курсыў т. Бухарына).

Вось тэарытычная сутнасьць канцэпцыі «арганізаванага капіталізму» тав. Бухарына, якая, як у крывым люстэрку, адлюстроўвае рэчаіснасьць. З гэтых надуманых абстрактных пабудаваньняў, якія мэханічна разрываюць адзіны жыцьцёвы працэс, ігнаруюць дыялектычнае перарастаньне адной катэгорыі ў другую, нямінуча выцякаюць старыя і новыя, «левыя» і правыя палітычныя памылкі т. Бухарына (права нацыі на самавызначэньне, дыскусія аб праграме партыі, Берасьце, прафсаюзная дыскусія, правы ўхіл).

З найноўшых памылак асабліва небясьпечна яго тэорыя аб крупэньні капіталізму, цесна зьвязаная з яго канцэпцыяй аб «арганізаваным капіталізьме».

Сучасныя капіталістычныя дзяржавы, сьцьвярджае тав. Бухарын, ёсьць вялізныя камбінаваныя трэсты, якія зьнішчылі ўнутры існуючых краін анархію вытворчасьці і змагаюцца адны з другімі на міжнароднай арэне; значыцца, крупэньне капіталізму можа наступіць толькі ў выніку міжнароднай вайны. І тут т. Бухарын не заўважвае, што, ідучы ў адзін пакой, ён рызыкуе трапіць у другі, у які суб'ектыўна ён і не хацеў-бы, бадай, трапіць. Калі сапраўды ў сучасных капіталістычных дзяржавах картэляваньне і трэстыфікацыя зьнішчаюць унутраную канкурэнцыю і калі капіталістычная гаспадарка зьяўляецца рацыянальнай гаспадаркай, то гэта забясьпечвае такую колькасьць матар'яльных рэсурсаў і такое іх разьмеркаваньне, што пытаньне аб замежных рынках траціць усякую вострасьць. Тым больш, што тэндэнцыя да разьвіцьця міжнародных манапалістычных аб'яднаньняў таксама ёсьць, у прыватнасьці, ужо ў цяперашні час Зомбарт і інш. налічваюць да 200 такіх аб'яднаньняў. Такая тэорыя льле ваду на млын сацыял-дэмакратаў і на каўцкіянцкую канцэпцыю аб ультра-імпэрыялізьме. Яе таксама лёгіча нельга прымірыць з магчымасьцю будаўніцтва сацыялізму ў асобнай краіне.

Аднак, т. Бухарын можа пярэчыць, што капіталістычная гаспадарка застаецца антаганістычнай з пункту погляду клясаў. Але гэтае пярэчаньне якраз перакульвае ўсё яго лёгічнае пабудаваньне. Клясавая супярэчнасьць паміж капіталістым і рабочым азначае, што перад намі грамадзтва заснаванае на вытворчасьці дадатковай вартасьці, што прадпалагае, напершае, вартасьць і, падрутсе, наёмную працу. Але «зарплата прадстаўляе сабой разгледаную ў іншай рубрыцы наёмную працу». («Введение критики политэкономии»).

У сваю чаргу катэгорыя зарплаты наперад вызначае продаж рабочай сілы, як тавару, і сродкі існаваньня для рабочых у таварнай форме, інакш кажучы прадпалагае рынак, мэханізм канкурэнцыі і цэнаўтварэньня, г. зн. тое, што т. Бухарын выключае. Такім чынам, гані прыроду ў дзьверы, а яна ўляціць у вакно! Усякі знаёмі з марксыцкай тэарытычнай эканоміяй, лёгка выявіць, у чым тут корань памылкі. Тав. Бухарын ізалюе сацыяльны момант ад эканамічнага, не заўважваючы, што адносіны паміж капіталістымі і рабочымі выступаюць у форме адносін паміж знадворна роўнапраўнымі інезалежнымі тавараўласьнікамі.

Хібнасьць пабудаваньня т. Бухарына выяўляецца і з другога боку. Дапускаючы змаганьне сучасных капіталістычных краін толькі на замежных рынках, завастраючы праблему збыту звонку, ён тым самым дапушчае і ўнутраную перавытворчасьць, бо для кожнай асобнай краіны ўвесь іншы сьвет служыць замежным рынкам. Але, паколькі ім робіцца і другое дапушчэньне, што на ўнутраных рынках няма канкурэнцыі і адсутнічае перавытворчасьць, замежны рынак зусім выпарваецца. Мэтафізычны падзел на замежны і ўнутраны рынак кідаецца тут у вочы. Калі канкурэнцыя лютуе на замежных рынках, то практычна гэта азначае канкурэнцыю і на ўнутраным рынку, па якім т. Бухарын занадта пасьпешна яе зьнішчыў, а не ў беспавятровых прасторах. Вельмі шкада, што аўтар «Тэорыі гістарычнага матэрыялізму» недарэчы забыў старое дылектычнае палажэньне: «нічога ўнутры, нічога звонку, што ўнутры, тое і звонку». Мы бачым, такім чынам, што прадпасылкі т. Бухарына ў сутнасьці нічога іншага не прадстаўляюць, як кантрадыкцію ін аб'екто (унутраная супярэчнасьць). У дадатак да ўсяго яшчэ атрымліваецца немагчымая блытаніна з паняцьцем «сусьветная гаспадарка». Выходзіць, што «дыфэрэнцыя спэцыфічная асаблівасьць) апошняга анархія... звароту у той час, як «нацыянальная» гаспадарка характарызуецца ўнутраной урэгуляванасьцю і арганізаванасьцю сваіх грамадзкіх адносін. Вось што атрымліваецца ад гульні ў аналёгіі, якія т. Бухарын выбраў стадарожнікам у сваіх лёгічных пабудаваньнях.

(Працяг будзе)

*) Гэты артыкул будзе надрукаваны ў № 21 «Бальшавіка», які выходзіць гэтымі днямі.

Ні адзін кілёграм хлеба не павінен загінуць!

На сёнешні дзень урадовай камісіяй ужо знойдзена складзкіх памяшканьняў, у якіх можа быць зложана 7 мільёнаў 400 тысяч пудоў хлеба. Акрамя гэтага, да 1-га сьнежня будзе закончана пабудова складаў Саюзхлеба на 600 тысяч пудоў.

Па арыентовачных даных да 1-га студзеня для хаваньня хлеба патрабуецца складаў на 9 мільёнаў пудоў.

Здаецца, што становішча са складзкімі памяшканьнямі зараз павінна ўжо было-б выйсьці з таго цяжкага стану, у якім яко было раней. Але на справе з-за галавацяпства і нядбайнасьці з боку некаторых устаноў, становішча з хаваньнем хлеба застаецца ўсё яшчэ ненармальным і пагражаючым.

Так, у некаторых мясцовасьцях хлеб кладзецца ў сапяныя базы, у склады з-пад скуры, дзе ён можа хутка псавацца, і яго неабходна тэрмінова перакідваць у другія склады.

Дрэнна абстаяла справа са складзкімі памяшканьнямі ў Слуцкім раёне, Бабруйскай акругі. Зараз Саюзхлебам даны тэрміновыя нарады на разгрузку Слуцкага раёну ад залежаў хлеба.

Трэба адзначыць, што збор тары, а таксама і мяшкоў, праходзіць вельмі дрэнна. Асабліва цяжкое становішча са зборам тары наглядаецца ў Аршанскай, Бабруйскай і Менскай акругах. Некаторыя ўстановы праяўляюць злачынную нядбайнасьць да пытаньня вызваленьня патрэбнай загатоўчым арганізацыям тары. Так, дзякуючы несваячасова прынятым мерам з боку Беларускага жывёла-малочнага саюзу, на млынох Аршанскай і Віцебскай акруг і ў Слуцку сабралася звыш 15 тысяч мяшкоў з вотрубямі. Урадовая камісія запрапанавала малочнаму саюзу неадкладна разгрузіць гэтыя вотрубі і спаражніць тару. Аб працы Беларускага малочнага саюзу гаворыць яшчэ адзін характэрны факт. У той час, як у Слуцку ўжо няма куды хаваць вялікую колькасьць адходаў, малочны саюз дадаткова накіроўвае з Воршы ў Слуцак вагоны з адходамі.

Уся грамадзкасьць павінна ўлічваць, што частка складаў да вясьненіх месяцаў павінна будзе быць апарожнена, бо яны заняты толькі часова. Такіх складаў па БССР ёсьць на 2½ мільёны пудоў. Акрамя гэтага, у летнія месяцы прыдзецца разгрузіць склады на 4 мільёны пудоў. Гэтаму пытаньню павінна быць аддана самая сур'ёзная ўвага і да 1-га сакавіка павінны ўжо быць падрыхтаваны памяшканьні для замены гэтых складаў.

Такім чынам, пытаньне са складзкімі памяшканьнямі застаецца ўсё яшчэ вельмі сур'ёзным, і ўся грамадзкасьць павінна прыйсьці на дапамогу ўрадовай камісіі ў выяўленьні памяшканьняў, якія прыгодны для хаваньня хлеба.

Шырока паставіць праблему кадраў

Увага савецкай грамадзкасьці яшчэ ня прыцягнута да гэтага пытаньня

МАБІЛІЗУЕМ УСЕ СІЛЫ І СРОДКІ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ПРАЛЕТАРСКІХ КАДРАЎ, БУДАЎНІКОЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГАСПАДАРКІ

Тое, што ў нас не хапае аграномаў і спэцыялістых па сельская гаспадарцы, гэта, зразумела не, навіна. Аднак, лічбы, якія характарызуюць гэтае становішча, сьведчаць, што сапраўднасьць значна сур'ёзьней і горш, чым мы гэта сабе ўяўляем.

Толькі некалькі фактаў. Для ўкамплектаваньня агранамічнай сеткі ў 1928-29 годзе нам не хапала 180 агранамаў. Гэта значыць, **што 30 проц. агрануктаў ня маюць... агранамаў.** Па асобных акругах малюнак яшчэ горшы. Так, аграсетка Полацкае акругі была недаўкамплектавана на 42 проц., Аршанскай акругі—на 43 проц.

Прыблізна такое-ж становішча і па іншых галінах сельскай і лясной гаспадаркі БССР. **Па лініі лясной гаспадаркі,** напрыклад, **недаўкамплектаваньне спэцыялістымі складае 30 проц.**—300 чал. Да запаўненьня зямлыўпарадчых кадраў не хапае каля 100 спэцыялістых.

Ня прыходзіцца ўжо гаварыць аб аграабслугоўваньні калгасаў і вытворчай каапэрацыі. Тут мы маем амаль катастрафічнае становішча. Для тых калгасаў, якія ўжо ёсьць, **не хапае па меншай меры 150 агранамаў** і прыблізна столькі-ж для абслугоўваньня вытворчай каапэрацыі.

Зусім зразумела, што патрэбнасьць нашай сельскай гаспадаркі ў спэцыялістых у бягучым 1929-30 годзе значна павялічваецца супроць патрэбнасьцяй у мінулым годзе. Ня лічачы таго, што штаты спэцыялістых ня былі ўкамплектаваны ў 1928-29 годзе, па бягучым год патрэбнасьць у спэцыялістых па ўсіх галінах сельскай гаспадаркі павялічваецца прыблізна яшчэ на 25 проц. супроць вызначаных мінімальных штатаў на 1928-29 год.

Калі-ж гаварыць аб патрэбнасьці ў спэцыялістых на працягу бліжэйшых чатырох год, то становіцца зразумелым, наколькі **мала мы думаем аб справе падрыхтоўкі патрэбных кадраў.** Варта падаць некалькі лічбаў, якія пацьвярджаюць гэтае палажэньне.

Паводле даных Наркамзему БССР, на працягу 4-х год нашай сельскай гаспадарцы будзе патрэбна: па зямлеўпарадкаваньні—797 спэцыялістых, для мэліярацыі—849, для культуртэхнічных работ—2.440, для торфараспрацовак—1.505, па с.-г. будаўніцтве—1.684, для раённай аграсеткі—678, на зоатэхніцы—3.450, для аказаньня вэтэрынарнай дапамогі—808, па рыбаводзтве—638, для абслугоўваньня лясной гаспадаркі—1.838, па машынізацыі сельскай гаспадаркі—14.840, у галіне індустрыялізацыі—4.027, па электрыфікацыі—1.425.

Раней, чым гаварыць аб тым, як падрыхтаваць такую вялікую армію спэцыялістых вышэйшай, сярэдняй і ніжэйшай кваліфікацыі, спынімся крыху на прычынах недаўкамплектаваньня кадраў спэцыялістых у мінулым і гэтым гадох. Асноўнай прычынай зьяўляецца **невыстарчальны тэмп выпуску спэцыялістых беларускімі вышэйшымі і сярэднімі навучальнымі ўстановамі.** Каб пават усе тыя, што канчаюць навучальныя ўстановы—беларускую с.-г. акадэмію, вэтэрынарны інстытут, тры с.-г. тэхнікумы—і заставаліся ў БССР, дык і то мы-б не змаглі цалкам запоўніць нашы мінімальныя штаты.

Між тым, наглядаецца **вельмі малое асяданьне ў БССР тых, што канчаюць беларускія ВНУ.** Сёлета, напрыклад, з выпуску акадэміі ў 35 чал. у БССР засталося толькі 6 чал. З прыблізна гэткага-ж выпуску вэтэрынарнага інстытуту на працы ў БССР засталося толькі 3 чал. Рэшта—адразу-ж паехала ў розныя месцы СССР.

Уцякаюць у іншыя рэспублікі ня толькі студэнты, якія нядаўна скончылі ВНУ, але і пават спэцыялістыя са стажам, якія ўжо не адзін год працуюць у БССР.

Галоўным чынам гэта тлумачыцца вялікай розьніцай у аплаце працы паміж БССР і інш. рэспублікамі. У 1928-29 годзе ў БССР раённы агранам атрымліваў 100 руб. пэнсіі ў месяц, у РСФСР-жа—125 руб. Сёлета наш раённы агранам атрымлівае ўжо 110 руб., але затое на РСФСР гэта стаўка павысілася да 150 руб. Або возьмем вучасткових агранамаў. У мінулым годзе ён у нас атрымліваў 85 руб., сёлета атрымлівае 90 руб. Па РСФСР-жа вучасткових агранам атрымліваў 100 руб., а зараз атрымлівае—130 руб.

Розьніца павялічваецца яшчэ больш, калі прыняць пад увагу, што ў іншых рэспубліках па лініі «Зернатрэсту» і «Колгаспэнтру» плацяць спэцыялістым значна больш, чым зямельныя органы ў РСФСР.

Становішча, якое стварылася ў БССР, патрабуе **тэрміновага прыняцьця самых рашучых мер.** У адваротным выпадку ня прыходзіцца сур'ёзна абгаворваць плямы падрыхтоўкі спэцыялістых. Мы ня здолеем дабіцца намечаных вынікаў у галіне сацыялістычнай рэканструкцыі нашай сельскай гаспадаркі, калі мы зараз-жа ня зоймемся канкрэтным выраішэньнем пытаньня аб кадрах спэцыялістых.

У даны момант напрошваюцца такія мерапрыемствы:

Трэба ў першую чаргу **дабіцца ўраўненьня ставак для спэцыялістых сельскай гаспадаркі па ўсіх распубліках.** Толькі такая мера можа ліквідаваць адсеў студэнтаў і перабежкі агранэрсаналу ў іншыя рэспублікі.

Паколькі мы адчуваем зараз вельмі востры недахват агранамаў для абслугоўваньня ўжо арганізаваных калектываў, бязумоўна мэтазгодна **зрабіць датэрміновы выпуск Беларускай с.-г. акадэміі.** Студэнты, якія перайшлі ўвосень на чацьверты курс, павінны скончыць акадэмію не ў наступную восень, а ў гэту вясну. Гэта дасьць нам каля 100 агранамаў перад самым сэзонам.

Як вядома, ужо сёлета мы адчуваем востры недахват у спэцыялістых сярэдняй і ніжэйшай кваліфікацыі. Ёсьць адпаведная пастанова аб падрыхтоўцы ў гэтым годзе некалькіх тыс. такіх спэцыялістых (трактарыстых, кіраўнікоў калгасаў, майстроў і г. д.). Заўважаецца, аднак, што арганізацыя курсаў для падрыхтоўкі гэтых спэцыялістых ідзе вельмі павольна.

Напрошваецца таксама **скарачэньне тэрміну навучаньня ў беларускім вэтэрынарным інстытуце,** каб хутчэй задаволіць запатрабаваньні вёскі ў вэтэрынарах. Між іншым, толькі сёлета было вырашана працягнуць тэрмін навучаньня ў гэтым інстытуце за 4-х да 5 год. Трэба зноў устанавіць 4-хгадовы тэрмін навучаньня.

Адным з карысных мер можа зьяўіцца **стварэньне ў БССР практычнага інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі.** У такім інстытуце павінны навучацца людзі, якія маюць вялікі практычны вопыт на сваёй спэцыяльнасьці, але якія ня маюць тэарытычнай падрыхтоўкі. У даным выпадку мы маем на ўвазе с.-г. рабочых, загадчыкаў саўгасаў, аб'езчыкаў, кіраўнікоў калгасамі і г. д.

Нарэшце, павінна быць зьвернута ўвага і **на кантрактацыю студэнтаў апошняга курсу ВНУ РСФСР.** Наркамзем БССР прызнаў патрэбным, каб на гэтую справу было сёлета выдаткавана 250 тыс. руб. У выніку гэтага мы можам атрымаць сёлета яшчэ 300 агранамаў.

Усе азначаныя меры, зразумела, ня вычэрпваюць пытаньня. Больш капітальна гэтым павінны заняцца Дзяржплян і Наркамасьветы БССР. На жаль, **яны дагэтуль ня праяўляюць інэртнасьць і пасыўнасьць у даным важнейшым пытаньні.** І Дзяржплян, і Наркамасьветы мала цікавяцца выяўленьнем патрэбнасьцяй нашай сельскай гаспадаркі ў спэцыялістых і яшчэ менш пакуль што робяць у галіне выраішэньня гэтай праблемы.

ВЭН.

Вылазка ашалелага дробнага буржуа

„Трук“ у літаратуры украінскага пісьменьніка В. Палішчука

Усе літаратурныя аб'яднаньні Украіны абураны хуліганскім трукам літаратурнае часопісі «Авангард» — органу згуртаваньня «Канструктыўнага дыпамізму», якая выходзіць пад рэдакцыяй **Валяр'яна Палішчука.**

З-ці нумар часопісі «Авангард» вышаў перапоўненым абываталь**шчынай,** літаратурнай хуліганшчынай і пахабшчынай, брыдкімі афарызмамі і бульварнай лаянкай. Самім пладавітым аўтарам пахабшчыны зьявіўся сам рэдактар В. Палішчук. Між іншым, брудам, у часопісі зьмешчаны «афарызмы» В. Палішчука, якія перапоўнены «пытаньнямі паруваньня», лаянкай і смакаваньнямі распусьніка. У яго «афарызмах» такія між іншым выразы, як:

«От жа-ж, Васіль Ярмілаў жыве, цьвіце, афармляе кніжкі, рэчы, карціны і нават народу людзкую, на партрэтах і ў побыце, поўны сіл і соку, — творыць на моц Авангарду і на жах назаднікам... Апрача таго, прымаючы пад увагу нязручнасьць цэрабкопаўскіх ложак для спараваньня, В. Ярмілаў распрацоўвае зараз танны, зручны і прыгожы варштат — ложак для выканаьня жыцьцёвых функцый людзкога арганізму»...

Выпады Палішчука прымаюць клясаав-варожую палітычную форму:

«Афарызмы — гэта звычайныя выцуклыя вымовы на тэмы звычайнага жыцьця, нават выказваюцца ў звычайнай форме. Выкажа іх просты чалавек, ніхто і ўвагі ня зьверне, а выкажа іх які-небудзь ...Ленін — цэлы сьвет абляцяць (ст. 111).

У іншых мясцох Палішчук разьлічвае на сьлюнявае мяшчанства: «Пры пацалунку ў губы, асабліва эратычную сілу дае даткненьне прасунутых праз губы языкоў адзін да аднаго...»

Палішчук капчае свае афарызмы з вялікім здавальненьнем дробнага буржуа мяшчаніна, які пацешыў бульварную публіку:

«— Я так рад, што дарваўся да палемічнага пяра і магу ад яго адстаць. Усе свае наасалелыя пытаньні хацеў-бы адразу раскрыць перад вамі... Як прыемна дарвацца да неабмежаваных выразаў уласнае думкі. Як прыемна пісаць, ведаючы, што табе таварышы дазваляюць падаць сваю думку, што над табою зьверху адзін толькі Галоўліт... і больш нікога».

Часопісь «Авангард» капчае свае старонкі такім лёзунгам:

— «Няхай жыве публічны сакавіты пацалунак ў голыя жаночыя грудзі»!

Валяр'ян Палішчук і яго калегі выкінулі мяшчанска-абываталькі трук дробнага буржуа, нячуваны дагэтуль у пралетарскай літаратуры Украіны. Зараз падняслася хваля абурэньня ўсіх пісьменьніцкіх арганізацый Украіны. Пралетарская грамадзкасьць дасьць рашучы адпор разбэшчаным дробным буржуа, якія пацяшаюць бульварнічнай і пашляцінай кулака, нэпмана і падонкі гарадзкога мяшчанства, дахадзячы да контррэвалюцыі.

Трук В. Палішчука і яго сяброў служыць на руку клясаваму ворагу і пралетарская грамадзкасьць не дазволіць у далейшым скарыстоўваць трыбуну пралетарскай літаратуры — часопісь «Авангард» для выказваньня дробна-буржуазных пачуцьцяў.

Пралетарскія пісьменьнікі БССР павінны сказаць сваё важкае слова ў асуджэньні гэтага ганебнага выпаду.

Камуна Імя „Зьвязды“ у Капыльскім раёне

Сялянская беднота двух вёсак Раеўскага сельсавету Капыльскага раёну арганізавала камуну імя нашае газэты. Падаем выпіску з пратаколу арганізацыйнага сходу:

«Мы, сляне в М.—Раеўскі, жывучы пры самай мяжы з панскай Польшчай, у дзень калектывізацыі на агульным сходзе пастанавілі арганізаваць камуну імя газэты «Зьвязда». Мы, камунары «Зьвязды», хочам стаць прыкладам для нашых братоў Зах. Беларусі і акаляючых вёсак па грамадзкім жыцьці і будаўніцтве сацыялістычнае гаспадаркі. Просім рэдакцыю «Зьвязды» ўзяць шэфства над нашай камунай. Просім зьмясьціць гэту выпіску ў газэце».

АПАРАТ НАРКАМЗЕМУ ПАВІНЕН БЫЦЬ РЭАРГАНІЗАВАНЫ*)

Работа зямельных органаў зараз набывае вялікае і адказнае значэньне ў сувязі з тымі задачамі, якія вызначаны XII зьездам КП(б)Б і верасьнёўскім пленумам ЦК. Справа рэканструкцыі сельскае гаспадаркі на зусім новых сацыялістычных падставах патрабуе адказнасьці і выразнасьці ў рабоце нашага апарату.

На фінансаваньне сельскае гаспадаркі ў гэтым годзе вызначаюцца вялікія сродкі. Паводле папярэдніх даных мяркуецца ў сельскую гаспадарку ўкласьці 62.197.000 руб., з якіх на аграмаджаны сэктар 56.826.000 руб. і на прыватны—5.371.000 руб.

Гэтыя лічбы не патрабуюць ніякага тлумачэньня, а зусім выразна павінны сьведчыць аб патрэбнасьці рашуча зьмяніць усе мэтады работы.

Што-ж мы маем зараз? Ц аможа НКЗ і яго мясцовыя органы справіцца з ускладзенымі на іх задачім.

Зараз мы маем такую структуру як самога апарату Наркамзему, так і яго мясцовых органаў, якая прыстасавана да абслугоўваньня паасобных дробных сялянскіх гаспадарак.

Справа перабудовы дробнае сялянскае гаспадаркі ў аграмаджаную сацыялістычную, абслугоўваньне ўжо арганізаваных калгасаў патрабуе аб'яднаньня кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, раскінутага па розных установах і наркамётах (Наркамгандаль, ЦСК, Лесбел каапэрацыя ўсіх відаў і інш.).

Адначасова трэба вызваліць Наркамзем ад раду функцый (зямельны суд, выдавецтва і інш.).

Апарат НКЗ, ня гледзячы на зьмененыя запатрабаваньні жыцьця, застаецца пастарому з функцыямі так зв. «агульнага кіраўніцтва», якое да гэтага часу ня мае пэўных форм і шляхоў.

Рад спэцыялістых павінны займацца гэтымі «агульнымі разважаньнямі» наконт «установак», «плянаваньня», увязак, а непасрэдна для вытворчасьці не хапае часу. Па абслугоўваньні аграмаджанага сэктару працуе выключна Калгассаюз і каапэрацыя, а група сельскае гаспадаркі працуе «наогул».

Штаты Наркамзему сьведчаць аб тым, што інтарэсы індывідуальных гаспадарак у працы зямельных органаў маюць ня меншае значэньне, як аграмаджаны сэктар, так напрыклад: у Белкалгассаюзе 14 спэцыялістых і ў групе сельскай гасп.—таксама 14.

Усё гэта вельмі дзіўна, калі параўнаць асыгнаваньні сродкаў па сэктарах.

Ці можа гэта зававоліць нас у такі адказны час? Зразумела, ні ў якім разе.

Наўкола гэтага пытаньня не стварэецца належнай грамадзкай думкі. Заданьні, якія высоўваюцца зараз жыцьцём, захлёстваюць апарат НКЗБ. Жыцьцё выпярэджвае меркаваньні і пляны апарату прыстасаванага пакуль што, галоўным чынам, для абслугоўваньня індывідуальных гаспадарак.

Між іншым, справа плянаваньня сельскае гаспадаркі зараз стаіць на абмеркаваньні ў аўгальна-саюзным маштабе. Нам-жа патрэбна зараз, не чакаючы канчатковага вырашэньня гэтага, правесьці рад мерапрыемстваў, якія давалі-б магчымасьць выканаць заданьне партыі і ўраду, зацікавіць гэтым пытаньнем паасобныя наркаматы, зрабіць гэтую справу справай усіх працоўных і ўсёй грамадзкасьці, бо пастаноўка пытаньня толькі ў межах Наркамзему і яго апарату не прыядзе да грунтоўнага, а можа выліцца ў перастаноўку асоб і крэслаў. Практыка стварэньня замест раней існаваўшых у Наркамземе кіраўніцтваў галінамі сель.-гас. (лясное, сель.-гасп. і адмэлізем) груп, ні ў якай меры зараз ня можа выраішыць асноўнага ў гэтым пытаньні. Трэба зьмяняць мэтад і формы працы.

Пастаноўка гэтага пытаньня не па дробязях, а па сутнасьці ўсёй справы набывае асабліва зараз вялікае значэньне.

Па нашай-жа думцы, пры існуючых асыгнаваньнях на сельскую гаспадарку, пакідаць пастарому працаваць—вялікая недарэчнасьць.

Наркамзем і яго мясцовыя органы павінны зрабіцца органамі, якія цалкам былі-б у першую чаргу прыстасаваны да абслугоўваньня аграмаджанага сэктару нашай сельскай гаспадаркі.

Наркамзем па прыкладзе ВСНГ павінен стаць кіруючым Камісарыятам у с.-гасп. вытворчасьці, а ня тым, чым ён ёсьць цяпер.

Патрабаваньні жыцьця па практыцы выканаьня першага году пяцігодкі (перавышэньне яе амаль па ўсіх галінах) ужо далі даволі сур'ёзна сябе адчуваць, а між тым у Наркамземе імкнуцца ў старыя арганізацыйныя рамкі ўпакаваць новае жыцьцё, якое, аднак, зьнішчае гэтыя перашкоды.

Зрабіўшы НКЗ сапраўдным кіраўніком сельска-гаспадарчай вытворчасьці, неабходна перадаць яму рад функцый ЦСК, галоўным чынам па сельска-гаспадарчай статыстыцы. Таксама Наркамгандаль павінен зразумець, што гандаль і вытворчасьць гэта справа аднаго пляну і гаспадаркі.

Высоўваючы гэтае пытанне, мы зварачаемся да РСІ, да ўсёй грамадзкасьці заяўцца гэтай справай.

ВАШЧЫЛА-ВІРЫН.

*) Друкуецца ў парадку абгаварэньня.

Заўтра

... Зразумела, цяперашніе пакаленьне прыносіць ахвяры, ахвяры на карысьць сацыялізму. Вялізарная, найбольшая частка прадукцыі павінна быць кінута на будаўніцтва.

(З дэклярацыі нямецкай рабочай дэлегацыі).

З обэр-манцёрам Фрыдрыхам Гаўфэ я сустрэўся ў пакоі для прыежджых добрускага рабочага інтэрнату. Гэтага высокакваліфікаванага нямецкага майстра выпісалі ў Добрушь, на фабрыку «Гэрой Працы» для мантажу новых машын фірмы Фойт. Запомніўся адзін вечар, калі манцёр увайшоў у пакой злосны, абураны.

— Я заўтра бяру разьлік,—закрычаў ён нечакана,—я заўтра бяру разьлік і еду дамоў... гэта немагчыма! Сёньня на вячэру нам далі толькі гарбату, хлеб і масла!..

За круглымі пазалочанымі акулярамі мітусіліся злыя аганькі; манцёр пацёскаў плячыма, стукаў цьвёрдай далонью па ражку стала і да кожнай фразы дабаўляў запытальную часьцінку «Нішт?», што сьведчыла аб высокай ступені ўзбуджэньня. Ён Фрыдрых Гаўфэ, зарабляе 30 рублёў у дзень і патрабуе добрага. сытнага харчаваньня. Якое яму дзела да таго, што ў каапэрацыйнай сталовай здарыўся рамонт і гэта выклікала часовыя непарадкі з харчаваньнем?

— Я палітыкі не чапаю, я лёяльны, але я кажу: гэтага вы, рускія, можаце працаваць у імя заўтрашняга дня, а мы, немцы, патрабуем, каб нам кожны дзень давалі патрэбную колькасьць калёрый...

Фрыдрых Гаўфэ ведае, колькі чалавеку трэба на дзень калёрый. Яшчэ ён ведае, што фірма можа абараніць яго інтарэсы. Толькі фірма! Ён з калегамі ўжо напісаў пратэст. Фірма павінна паклапаніцца. Фірма—галоўнае. Фірма—усё. О, яны добрыя служачыя сваёй фірмы!

Быў такі выпадак, калі на фабрыцы вышаў увесь запас даваеннай патэнтаванай набіўкі для сальніц высокага ціску, якое цяпер няма на рынку. І тады нашы рабочыя зьвярнуліся да Гаўфэ, каб ён сказаў хэмічны састаў набіўкі. Гаўфэ добра ведаў, як робіцца набіўка.

— Графіт ёсьць?—запытаў сутулаваты мапыніст Пранузенка, нястомны вынаходца. Янкавяк—добрускі немец з былых палонных—растлумачыў обэр-манцёру пытаньне машыністата.

— Ёсьць,—хмура адказаў немец.

— Сьвінцовы глёт?—наступаў Пранузенка

— Ёсьць.

— Азбэст?

Гаўфэ сярдзіта павярнуўся праз плячо кінуў:

— Няма... Ня ведаю, Доннэр-Вэттэр! Гэта сакрэт фірмы.

— Гэта сакрэт капіталіста!—крыкнуў Міша Пастухоў, сакратар ячэйкі мэханічнага цэху,—ты рабочы, ты павінен падзяліцца з намі... скажы яму, Янкавяк!

— Не, не, я ні ва што ня веру... Я чалавек нэйтральны.

Гаўфэ ня выдаў сакрэту.

— Нэйн, Нэйн,—круціў ён галавой. Ён адчуваў на сабе вострыя напружаныя погляды сьлесароў брыгады. Што хочуць ад яго гэтыя людзі? Фрыдрых Гаўфэ ўсё роўна ня скажа складу набіўкі. Што ў яго, у обэр-манцёра фірмы Брудэргаўз, агульнага з гэтымі людзьмі і іхняй фабрыкай?

— Убачыш, што праз пяць год у нас будзе!—заядла гаварыў Пастухо

Пачалося абсьледваньне Лесбелу

У рабоце апарату трэсту заўважаны рад нездаровых зьявішч

Кругавая парука, замазваньне і рвацтва

Дрэва-апрацоўчая прамысловасьць БССР адыгрывае вялікую ролю ў індустрыялізацыі нашай краіны. Яна складае каля 24 проц. (без лесазагатовак) усёй прадукцыі нашай прамысловасьці. Усёй лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьцю ў нас кіруе Лесбел, звароты якога павінны дасягнуць у 1929-30 годзе 130 мільёнаў рублёў. Але, ня гледзячы на ўсю важнасьць лясное гаспадаркі ва ўмовах БССР, апарат Лесбелу не заўсёды добра спраўляецца з сваёй работай. Лінія яго работы па рэарганізацыі дрэваапрацоўчай прамысловасьці не заўсёды выразная і ясная.

Лесбел яшчэ не наладзіў, як сьлед тэхнічнага кіраўніцтва прадпрыемствамі, не прапрацаваў дырэктывы аб зьніжэньні сабекошту, якая павінна даць па трэсьце эканомію на 11 мільён. рублёў. У працы Лесбелу адсутнічае пляновасьць, не праведзена яшчэ досыць выразна функцыянальная сыстэма. У сьцепах Лесбелу каённа, а часам і ворожа адносяцца да практыкантаў і маладых спэцыялістых.

На аб'яднаным сходзе супрацоўнікаў Лесбелу і рабочай брыгады, якая вылучана на заводзе «Дрэваапрацоўшчык» у дапамогу камісіі на абсьледваньні працы Лесбелу, выявілася, што сапраўды ў апараце Лесбелу далёка ня ўсё добра. Пасьля дакладу прадстаўніка ЦКК-РСІ т. **Лявончыкі** аб задачах і мэтадах абсьледваньня выступіў рад супрацаўнікоў Лесбелу. Але значная частка выступаўшых, замест таго, каб выкрыць усе недахопы ў рабоце, пачала замазваць іх, хваліць сваю работу і ўсю віну ўзвальваць на «аб'ектыўныя ўмовы» і на работу іншых установаў, як НКЗ, Эканомнарада і г. д.

Знайшліся нават такія супрацаўнікі, якія ў сваіх прамовах спрабавалі браць пад абарону работнікаў Лесбелу **Чаплінскага і Рагінскага**, якіх за іх шкодную дзейнасьць у Лесбеле судзіў пралетарскі суд.

Супрацаўнік Лесбелу эканамісты-рацыяналізатар Шмыхаў выступіў з «тэорыяй», што зарплата ў нас павінна зьяўляцца адзіным стымулам у працы. Ён зганяецца ўступіць у сацыялістычнае спаборніцтва пры абавязковай умове, калі яму будзе павышана зарплата.

Агульны сход як сьлед ацаніў гэта рвацкае і шкурніцкае выступленьне Шмыхава і рашуча асудзіў яго. Аднак, каранёные Шмыхаўшчыны ёсьць сярод некаторых іншых спэцыялістых Лесбелу. Так, супрацоўнік Лесбелу **Танхілевіч** выступіў супроць пастановы ЦКК-РСІ аб спэцыялістых-перабежчыках.

Камісія, якая прыступае да абсьледваньня Лесбелу, павінна ўлічыць усе гэтыя ненармальныя зьявішчы і аздаравіць яго работу.

БРЫГАДЗІР.

НА СХОДЗЕ БІБЛІЯТЭЧНЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ

17-га лістапада ў доме працаўнікоў асьветы адбыўся першы сход бібліятэчных працаўнікоў гор. Менску, прысьвечаны **бібліятэчнаму паходу.**

Запрошаныя на сход прадстаўнікі Белдзяржвыдавецтва, друку і письменьніцкіх арганізацый, як зазвычай, не зьявіліся. Сход пачаўся дакладам аб бібліятэчным паходзе прадстаўніцы Наркамасьветы т. Дзямідовіч. Яна спынілася на момантах шырокага абсугоўваньня кніжкаю сацыяльных груп рабочых, батрацтва, бядняцтва і калтасьнікаў; на папаўненьні бібліятэк (якія на 50 проц. засьмечаны шкоднаю кніжкаю) патрэбнаю кніжкаю; на прыцягненьні ўвагі самай шырокай грамадзкасьці да справы бібліятэчнага паходу і на перападрыхтоўцы кадраў бібліятэчных працаўнікоў, якія ў большасьці сваёй зьяўляюцца палітычна-пішісьменнымі і ня маюць патрэбнай, прынамсі, сярэдняй, асьветы.

Пасьля дакладу быў заслуханы плян бібліятэчнага паходу, складзены цэнтральнай камісіяй паходу, у якім асноўная палітычная ўстаноўка чаргавалася з канкрэтнымі задачамі і мерапрыемствамі паходу.

Як даклад, так і плян выклікалі бурныя спрэчкі.

Сход зьвярнуў увагу цэнтральнай камісіі на тое, што яна сваячасова не наладзіла адпаведнага кіраўніцтва паходам. У асяродзішчы камсамольскіх арганізацый і па акругах паход распачаўся самацёкам, без належнага інструктаваньня з боку паходнага штабу. Вакол справы бібліятэчнага паходу ня складзена глыбокай грамадзкай думкі. Зусім ненармальна тое, што нашы письменьнікі ня прымаюць абсалютна ніякага ўдзелу ў працы паходу. Яны адарваліся ад мас, ня ідуць у рабочыя клюбы і на прадпрыемствы за сацыяльным заказам. Гэта ганебнае зьявішча ў такой высокакультурнай справе, як бібліятэчны паход, як узьняцьце ролі кніжкі на належную вышыню, камсамол і письменьніцкія арганізацыі павінны быць у авангардзе.

А з боку Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва з якімі адносінамі мы сустракаемся?—БДВ ня цікавіцца нашай справай—зазначалі прамоўцы.

Яно зварачаецца да нас тварам толькі тады, калі яму патрэбна распаўсюдзіць патрэбную колькасьць кнігак. У нас дасюль няма беларускай кніжкі для маладасьменнага чытача, выданай буйным шрыфтам. І гэта адна з значных прычын вялікага процанту рэцыдыву ў справе ліквідацыі пішісьменнасьці. Ўжо сёньня мы павінны былі заслухаць даклад БДВ аб выданьні таннай кніжкі. Калі па РСФСР гэтае выданьне набыло грандыёзныя разьмеры, у нас яшчэ ня зроблена першага кроку.

Плян цэнтральнай камісіі пры Наркамасьветы павінен дадаткова ўвесьці канкрэтныя патрабаваньні ад Белдзяржвыдавецтва.

Трэба ўзьняць кампанію за фізычнае захаваньне кніжкі, за павялічэньне яе звароту. Гэта плянам не прадугледжана. У нас вялікая колькасьць малых бібліятэчных пунктаў. Магчима, што было-б мэтазгодным зьліць іх разам, бо часьцей ідуць у буйныя бібліятэкі.

Трэба часьцей асьвяжаць бібліятэкі-перасоўкі (на заводзе «Пралетары» ўсе кніжкі перачытаны, а новых не прысылаюць). У раёнах з вялікім лікам чырвоных куткоў трэба стварыць буйныя бібліятэчныя пункты.

Цэнтральная бібліятэчная камісія пры Наркамасьветы ня досыць сур'ёзна прадумала справу бібліятэчнага паходу. Няма ўвязкі паміж саюзнымі і палітасьветнымі бібліятэкамі. Агітацыйна-прапагандысцкая камісія паходу не выкарыстоўвае ў належнай меры такіх удзячных агітацыйных момантаў, як кіно, радыё, друк.

Бібліятэчны паход гэта новая эра ў бібліятэчнай справе. Са сьвежымі сіламі і энэргіяй уступаем мы ў вялікі культурны паход. І гэтыя сілы павінны быць накіраваны ў апаведнае рэчышча, павінны падлягаць сур'ёзнаму плянаваньню.

Паход патрабуе павялічэньня сродкаў на бібліятэчную справу, аб гэтым трэба паклапаціцца адпаведным інстанцыям. Ужо ўзьнята халайніцтва перад СНК аб дадатковай да біб. фондаў датацыі.

Па раёнах патрэбна арганізацыя біб. пунктаў. Па РСФСР яна праходзіць за сродкі Каапсаюзу. Гэтую ўдалую практыку трэба скарыстаць і ў нашых умовах для разгортваньня шырокай сеткі бібліятэчных пунктаў па раёнах.

Зараз на ўсіх франтох перабудовы нашага жыцьця ў сацыялістычным нашарку нястрымна разгортваецца сац. спаборніцтва. Асобныя бібліятэкі ўжо выклікалі адна другую на сац. спаборніцтва за лепшую гастаноўку ўсёй біб. працы ці яе асноўных момантаў. Але і тут няма адпаведнага кіраўніцтва гэтым жывым мэтадам працы з боку цэнтр. камісіі бібліятэчнага паходу.

Палагульваючы ўсе гэтыя надзвычай каштоўныя заўвагі, вынесеныя сходам бібліятэчных працаўнікоў па дакладу т. Дзямідовіч, нельга ня спыніцца на характары самога сходу.

Выключная жывасьць і яркасьць сходу, бурна разгорнутыя спрэчкі сьведчаць аб поўнай пасьпяховасьці бібліятэчнага паходу, аб яго сваячасовасьці і вялікай зацікаўленасьці з боку бібліятэчных працаўнікоў. Бібліятэчны паход не зьяўляецца часовай кампаніяй, а штодзённай справай кожнага культурніка да моманту стварэньня належных умоў у працы бібліятэк.

П.

У пятніцу, 22-га лістапада, а 6-й гадзіне ўвечары, у залі пасяджэньняў Менскага акруговага камітэту партыі адбудзецца

пашыраная нарада бюро вытворчых ячэек

Фрунзаўскага раёну па пытаньні аб становішчы падрыхтоўкі вытворчых ячэек да чысткі партыі.

На нараду павінны зьявіцца ўсе члены і кандыдаты бюро вытворчых ячэек і т. т., вылучаныя ад РК для агляду гэтай працы ў ячэйках.

МЕНСК

Тарыфныя згоды на работнікаў бюджэтных установаў

Дырэктыўны ліст СНК БССР і ЦСПСБ

СНК БССР і ЦСПСБ зьвярнуліся да ўсіх наркаматаў, акрвыканкомаў, ЦП саюзаў і Акрпрафбюро з дырэктыўным лістом аб заключэньні тарыфных згод на работнікаў бюджэтных установаў на 1930 г.

Прафсаюзныя арганізацыі і бюджэтныя ўстановы павінны зараз-жа прыступіць да перагляду дагавароў-згод з тым, каб уся работа была скончана не пазьней 25 сьнежня 1929 г.

Мясцкомам прапанавана вылучыць камісіі для праверкі выкананьня мінулага дагавору і абгаварыць вывады абсьледваньня на агульных сходах. Уся праверачная работа павінна быць скончана не пазьней 1-га сьнежня.

СНК і ЦСПСБ падкрэсьліваюць, што дагаворы-згоды павінны зьяўляцца 2-х баковым дагаворам: побач з абавязацельствам, якое бярэ на сябе адміністрацыя ўстановы, служачыя павінны ўзяць на сябе абавязак паставіць работу апарату на належную вышыню, шпяхам рацыянальнага скарыстаньня рабочага часу, барацьбы з прагуламі, бюракратызмам і цяганінай і лепшага абслугоўваньня наведвальнікаў.

Пленум ЦП савецкіх і гандлёвых служачых

Сёньня адкрываецца пленум цэнтральнага праўленьня саюзу савецкіх і гандлёвых служачых. Асноўнае пытаньне, якое стаіць на пленуме, вывады абсьледваньня ЦП саюзу. Аб гэтых вывадах ужо паведамлялася ў газэце «Зьвязда». Пленум павінен намеціць арганізацыйныя меры для аздараўленьня прафработы у мэтах прыстасаваньня яе да асноўных задач прафарганізацый у сучасны пэрыяд.

Гэрої працы

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў надаць годнасьць гэрояў працы т. т. **Стаўроўскай** Варвары Міхайлаўне, **Цэхановічу**, Юстыну Сьцяпанавічу, і **Карымаву**, Рыгору Іванавічу.

Тав. **Стаўроўская**—34-гадовы стаж працы, мае рэвалюцыйныя заслугі і добрыя водзывы аб працы.

Тав. **Цэхановіч**—працаваў 43 гады на вытворчасьці, пры царскім рэжыме прымаў ўдзел некалькі раз у забастоўках, прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху.

Тав. **Карымаў** — рабочы **Добрускай** фабрыкі, працуе на фабрыцы 38 год. Пры царскай уладзе сядзеў у турме за падбухторваньне рабочых да непадпарадкаваньня мясцовай уладзе. Зараз Карымаў прымае актыўны ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве.

Пэрыядычныя набаўкі да зарплаты пэдагагічных працаўнікоў

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў праект пастановы ЦВК і СНК БССР аб устанаўленьні пэрыядычных набавак да зарплаты некаторых катэгорый культурна-асьветных працаўнікоў.

Пэрыядычную набаўку атрымліваюць: пэдагагічныя працаўнікі ўсіх школ сацыяльнага выхаваньня, дашкольных устаноў, дзіцячых дамоў, вячэрніх школ рабочай моладзі, вячэрніх школ навышпанага тыпу; пэдагагічныя працаўнікі і інструктары—прафсыянальных школ, вучэбна-вытворчых майстэрань, тэхнікумаў, рабочых факультэтаў, а таксама загадчыкі народных дамоў і хат-чытальень.

Пэрыядычныя набаўкі паказаным працаўніком выплачваюцца за кожныя пяць поўных гадоў працы. Разьмер гэтых набавак вызначан для розных катэгорый у суме ад 60 да 150 рублёў у год.

Зьбіраньне матар'ялаў аб загінуўшых беларускіх рэвалюцыянэрах

У 1930 годзе прапоўныя БССР будуць сьвяткаваць 10 гадавіну вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

Каб увекавечыць памяць усіх тых, хто аддаў сваё жыцьцё за вызваленьне Беларусі ад польскіх акупантаў, Музэй Рэвалюцыі распачаў зьбіраньне матар'ялаў, якія датычаць рэвалюцыйнай барацьбы рабочых і сялян у 1919-20 годзе.

Матар'ялы і весткі аб загінуўшых барацьбітох трэба накіроўваць ў Музэй Рэвалюцыі (Менск, вул. Урыцкага).

ВЫСТАЎКА ЛУБКОЎ

У Доме Чырвонай арміі адкрылася выстаўка лубкоў, якія выданы Белдзяржвыдавецтвам і распаўсюджваюцца ў горадзе і на вёсцы. Выстаўка адкрыта штодзенна ад 12-га да 20 лістапада. Уваход ад 6-й да 9-й гадзіны ўвечары.

Навіны МЦРК

ВЫДАЧА ГАЛЁШАЎ

З 14-га лістапада крамы МЦРК будуць адпускаць галёшы найпучыкам, ня прытрымліваючыся адзначанага ў талёне гатунку. Па любым талёне будуць адпускацца любыя галёшы. Талёны на галёшы маюць моц да 25-га лістапада.

СПЫНЕНА ДАСТАЎКА ГАРОДНІНЫ НА ДОМ

У сувязі з недахватам транспартных сродкаў і наўпасьцю вялікай колькасьці нявыкананых заказаў, праўленьне МЦРК часова спыніла прыём заказаў на дастаўку гародніны на дом. Ва ўсе крамы, дзе прадаецца гародніна, будзе наладжана нармальная дастаўка адсартаваных прадуктаў.

На прыстані Шастовічы гніе бульба

На адрас рэдакцыі ўчора паступіла тэлеграма наступнага зьместу: «Прымеце меры: бульба гніе на прыстані Шастовічы». Наш супрацоўнік зьвярнуўся ў Наркамгандаль, дзе ў адказ на гэту тэлеграму было паслана тэлеграфнае паведамленьне Мазырскаму Акргандлю аб прыняцьці тэрміновых мер для захаваньня бульбы.

Да ведама ўсіх установаў і грамадзкіх арганізацый

Згодна пастановы Цэнтральнай камісіі па правядзеньні дня ўраджаю і калектывізацыі (14-га кастрычніка) па БССР, усе сродкі, якія зьбіраліся праз правядзеньне нядзельнікаў або адлічэньняў ад зарплаты на 1-ю трактарную калёну БССР, цэнтралізуюцца і іх трэба здаць на бягучы рахунак у адну з наступных банкавых установаў:

1) У Касы ашчаднасьці на бягучы рахунак Галоўнай Касы Ашчаднасьці за № 1588.

2) У філіялы Дзяржбанку ў БССР—бягучы рахунак № 985.

3) У с.-г. крэдытныя т-вы—бягучы рахунак Белсельбанку № 208.

Арганізацыя т-ва прыхільнікаў кіно

Пры Культаддзеле ЦСПСБ арганізавана таварыства прыхільнікаў савецкага кіно, якое ўжо прыступіла да працы

Бюро таварыства вызначыла спэцыяльныя гадзіны для дачы кансультацый па справах кіно. Аргбюро дае парады і ўказаньні па пытаньні, як наладзіць працу ячэек ТПСК (таварыства прыхільнікаў савецкага кіно). Яно займаецца арганізацыяй ячэек пры клюбах і на прадпрыемствах.

Наогул ТПСК мяркуе сваёю працаю ахапіць клюбы і чырвоныя куткі як у Менску, так і па акругах БССР

Дайце адказ

Пралетарыяцкая ВНУ патрабуе перагляду сацыяльнага складу студэнцтва. У гэтай справе павінна прыняць удзел наша савецкая грамадзкасьць, адпаведныя ўстановы і арганізацыі, без чаго гэта важная праца ня дасьць нам належных вынікаў.

Але зусім іншае мы маем на справе. Так, напрыклад, пэдфак БДУ зрабіў рад запытаньняў установам на месцы пражываньня сваякоў студэнтаў, якія падлягаюць праверцы. Але адказу ад гэтых установ да апошняга часу не паступіла. Між іншым, зроблены запытаньні 1-му, 2-му і 3-му раёнам гарадзкой міліцыі. Паслана запытаньне Самахвалавіцкаму РВК (Меншчына), але гэтыя ўстановы цэлымі месяцамі маўчаць і не даюць ніякага адказу. З-за такіх нядбайных адносін да справы затрымліваецца такая важная работа, як выяўленьне чужога элемэнту сярод студэнцтва.

Падрыхтоўка да зьезду ўдарных брыгад не вядзецца

Да ўсесаюзнага зьезду ўдарных брыгад засталося мала часу. Падрыхтоўка-ж да зьезду ў Менску амаль не вядзецца. Прафсаюзныя арганізацыі недапушчальна пасьпяўна аднесьліся да гэтай важнай справы. Яны абмежаваліся рассылкай на месцы абажнікаў і не прынялі ніякіх мер да правядзеньня падрыхтоўкі да зьезду.

Рабочым масам ня былі растлумачаны важнасьць і значэньне зьезду ўдарных брыгад. Падрыхтоўка да зьезду не знайшла адбітку і ў насьценгазэтах.

На многіх прадпрыемствах рабочыя ведаюць аб зьездзе і надыходзячай акруговай канфэрэнцыі ўдарнікаў з газэт, а не ад прафсаюзаў. На многіх буйных прадпрыемствах дагэтуль нават не абраны дэлегаты на Менскую акруговую канфэрэнцыю. На хлебазаводзе дэлегаты былі абраны не на агульным сходзе рабочых заводу, а на сходзе ўдарнікаў. І толькі пасьля растлумачэньня пастанова была скасавана і дэлегатаў абралі ад усіх рабочых заводу.

З-за фармальных адносін да такога важнага пытаньня сарвана Менская акруговая канфэрэнцыя ўдарнікаў, якая зараз перанесена на 30-е лістапада.

Аб адзначаных фактах шмат гаварылі на нарадзе пры ЦСПСБ, а таксама на нарадах пры саюзах мэталістых, харчавікоў, будаўнікоў і інш., дзе ЦП і нізавыя прафчэйкі інфармавалі аб ходзе падрыхтоўкі.

На ўсіх нарадах адзначана патрэбнасьць рашучага пералому ў падрыхтоўцы да Менскай акруговай канфэрэнцыі ўдарнікаў і ўсесаюзнага зьезду.

Выбары дэлегатаў павінны быць скончаны да 25 лістапада.

З учарашняга дня ва многіх прадпрыемствах пачаліся заводзкія канфэрэнцыі і агульныя сходы рабочых, прысьвечаныя падрыхтоўцы да канфэрэнцыі ўдарнікаў. У часе абедзенага перапынку праводзяцца гутаркі з рабочымі. На радзе прадпрыемстваў мэталёапрацоўчай прамысловасьці склікаюцца заводзкія канфэрэнцыі, на якіх будуць пастаўлены пытаньні аб выніках работы ўдарных брыгад і заключэньні новых дагавароў па сацыялістычным спаборніцтве. Усе прафсаюзы ў бліжэйшыя дні склікаюць сходы прафактыву. Некаторыя саюзы мабілізавалі многіх работнікаў для праверкі падрыхтоўкі да зьезду ўдарных брыгад.

Ад АК МОПР'у

У чацьвер, 21-XI, а 6 гадз. увеч. у памяшк. АК МОПР'у склікаецца інструктыўная нарада Мопраўскай брыгады, якая выяжджае ў Барысаў.

На нараду павінны зьявіцца наступныя т.т.: Калмык, Канстанцінаў, Каган, Хмялеўскі, Мільнер, Файнштэйн, Гаркаві, Ліпманава, Робінраўт, Бэрнацкі, Любінская, Кацман, Каральчук і Янушкевіч.

Яўка для ўсіх абавязкова.

— У чацьвер, 21-XI, а 7 гадз. увеч. адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму Менаўруткому МОПР'у.

Парадак дня:

1. Інфармацыя Фрунз. і Кастрычн. РК МОПР аб ходзе кампаніі агляду ячэек і зімовай дапамогі.
2. Аб паездцы ў Барысаў.
3. Аб гарадзкой канфэрэнцыі піянэраў і вучняў.
4. Бягучыя справы.

Яўка для ўсіх членаў і канд. прэзыдыуму АК—абавязкова.

ДОМ АСЬВЕТЫ

Сёньня, 20-га лістапада, а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца агульны сход прафактыву саюзу працасьветы з удзелам усіх асьветнікаў г. Менску з наступнай абвесткай дня:

1. Вынікі Кастрычніцкага пленуму ЦП саюзу—дакл. т. **Рычноў.**
2. Даклад аб сацспаборніцтве т. **Мельніка.**

У чацьвер, 21-га лістапада, а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца сход тэхнічак і ўтрыманак членаў саюзу працасьветы г. Менску з наступнай абвесткай дня:

Вынікі 1-га году пяцігодкі і пэрспэктывы сацыялістычнага будаўніцтва. Бягучыя справы.

Яўка абавязкова.

ДОМ КАМАСЬВЕТЫ

Сёньня, а 7 гадзіне ўвечары ў габінэце партработы адбудуцца заняткі антырэлігійнага семінару па першай тэме: «Пралетарыят і рэлігія».

Яўка ўсіх кіраўнікоў анты-рэлігійных гурткоў абавязкова.

— 20-га лістапада, а 7 гадзіне ўвечары ў Доме Камасьветы (парт. габінэт) адбудзецца нарада прапагандыстых адзінай партшколы.

Яўка абавязкова.

— 21-га лістапада, а 7 гадзіне ўвечары там-жа адбудзецца нарада выкладчыкаў агульна-адукацыйных прадметаў адзінай партшколы.

БДУ. Бюро парткалектыву КП(б)Б паведамляе, што адкрыты сход парткалектыву БДУ адбудзецца ў актавай залі 20-га лістапада, а 8 гадз. увечары.

Заняткі гурткоў па партасьвеце адбудуцца ў гэты-ж дзень ад 6 да 8 гадз. увечары.

— Сёньня, а 8-й гадз. увечары—арганізацыйны сход усіх таварышоў, якія запісаліся ў шахматна-шашачны гурток пад кіраўніцтвам тав. **Маззля.**

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

У серраду, 20 лістапада, а 8 гадз. увечары ў залі пасяджэньняў гарсавету адбудзецца

вечар, прысьвечаны адчыненьню курсаў вылучэнцаў пры ЦК КП(б)Б.

На адчыненьне курсаў запрашаюцца члены ЦК КП(б) Б, ЦКК, АК, АКК, ЦВК, СНК і ЦСПСБ, якія ўваходзяць па сваіх мандатах, іншыя па запрашальных білетах.

САВЕТ КУРСАЎ.

З листоў рабселькораў

Замест лазьні—дом былому афіцэру

Яшчэ ў 1923 годзе было пастаноўлена пабудаваць у м. **Койданаве** агульна-грамадзкую месцачковую лазьню. Мясцовымі грамадзянамі ў парадку працавіннасьці высечана, прывезена на месца і падрыхтавана да будаваньня больш 300 шпёў дрэва.

Але вось былы афіцэр, які быў у той час старшынёю Койданаўскага месцачковага савету, загадаў пабудаваць з гэтых бярвеньняў яму дом. І дом быў пабудаваны.

Такім чынам, дом былому афіцэру **Нупрыку быў** пабудаваны, а ўсё насельніцтва вымушана мыцца ў прыватнай маленькай лазьні ў в. Макаўчыцах, дзе да рэчы сказаць, пануе поўная антысанітарыя.

Трэба адабраць ад Нупрыка дом і пабудаваць месцачковую лазьню.

ПІЛІП СКУРАТ

Лепшых пажарнікаў прэміюем

Сацыялістычнае спаборніцтва ў Менскай пажарнай камандзе пачалося толькі ў чэрвені месяцы г. г. Нядаўна праведзеная праверка выкананьня сацдагавору выявіла, што ёсьць цэлы рад пажарнікаў, якія паказалі значныя дасягненьні ў выкананьні асобных пунктаў сацдагавору.

За добрае правядзеньне сацспаборніцтва, у часе Кастрычніцкіх урачыстасьцяй прэміяваны наступныя таварышы: рабочы пажарных майстэрань т. **Вашкевіч** за актыўны ўдзел у рамонце пажарнага аўтабуса і шофэр пажарнай машыны т. **Ціханкоў**; старэйшы трубнік т. **Запольскі**, каваль пажарнай майстэрні т. **Дубэрштэйн** і інш. Усяго 10 чалавек.

МІНІН.

Галавацяпы

Калі **галоўнай управе шасэйных і грунтавых дарог** і Аўтатранспарту Беларусі трэба было адпраўіць у Магілеў пэк і крэязотавы алей для будаўнічых работ, то яна (галоўн. управа) замест Магілева накіравала некалькі вагонаў у Віцебск і Бабруйск. У паказаных пунктах гэтыя матар'ялы зусім непатрэбны, а таму вагоны прабыталіся доўгі час. Галоўная ўправа за прастоі заплаціла больш чым па 150 р.

Страты ад ліпшага прабегу вагонаў, ад затрыманьня перавозкі другіх тавараў, ад таго, што ў Магілеве ў часе «блуканьня» вагонаў па розных станцыях будаўнічыя работы стаялі—відавочныя. Хто адкажа за гэтакае галавацяпства?

ВОКА.

Расьце калгас „Зьвязда"

З калгасу імя газэты «Зьвязда» паведамляюць, што калгас расьце эканамічна і культурна. Зараз у калгасе аб'яднаны 192 гаспадаркі. 17-га кастрычніка на агульным сходзе вёскі Насовічы ўсе гаспадары ў ліку 107 пастанавілі калектывізавацца. На гэтым-жа сходзе пад клюб калгасу перадана мясцовая царква. Зараз куплены радыё-прыёмнік і пастаўлены ў былой царкве. 7-га лістапада адбылося ўрачыстае адчыненьне клюбу, на якім прысутнічалі прадстаўнікі раёну і акругі

Б.

Ліпкія рукі

Крамная камісія **рабочага каапэратыву песапільнага заводу «Праца»** дэфіцытныя тавары разьмяркоўвае так, што вялікая частка застаецца ў ліпкіх руках старшыні крам. камісіі і яго брата. Дагэтуль ён спрытва замятаў свае сьляды, але... але ня ўсё добра, што добра замятаецца.

РАБОЧЫ.

Першыя ў самаабкладаньні

Самаабкладаньне ў **Бягомльскім раёне праведзена** перш за ўсё ў Мсьціскім сельсавеце. У некаторых вёсках гэтага сельсавету самаабкладаньне праведзена на 50 проц. Грошы ў суме некалькіх тысяч рублёў, атрыманыя ад самаабкладаньня, будуць скарыстаны на пабудову Мсьціскай сямігодкі.

Мсьціскі сельсавет выклікае Ітанскі і Некельскі сельсаветы хутчэй правесьці самаабкладаньне.

А. БУЗА.

Дзе няма гаспадарчага вока

На **заводзе «Энэргія»** будуецца новы кацёльны цэх.

Як-жа ідзе гэта будаўніцтва?

Дрэнна. Ужо адно тое, што нядаўна абвалілася новая сьцяна кацёльнага цэху, сьведчыць аб тым, што няма належнага тэхнічнага нагляду. Перакладка сьцяны абыйшлася заводу больш 600 рублёў. А хто можа даць гарантыю, што ня сёньня-заўтра не абваляцца другія сьцены.

Трэба зараз-жа пераглядзець усю пабудову цэху.

Ікс. 2-гі.

ЧЫГУНАЧНІКІ!

21 лістапада ў клюбе „ІЛЬІЧА", а 6 гадз. увечары

— АДБУДЗЕЦЦА —

Канфэрэнцыя чытачоў газ. „ЗЬВЯЗДА".

Парадак дня: Даклад рэдакцыі газ. «ЗЬВЯЗДА». Пасьля дакладу мастацкая частка.

Кастрычніцкі райком КП(б)Б.
Вучпрафсож і рэдакцыя газ. «Зьвязда».

ПЭДГАБІНЭТ

Расклад работы сэкцый і гурткоў на 1929-30 навучальны год.

Даты заняткаў	Назва сэкцыі або гуртка	У колькі гадзін.
7 і 17 Кож.	Сэкц. Політэхнічнага выхаваньня . . .	у 7 гад. ув.
4 і 24 м-ца	„ антырэлігійнага выхаваньня . . .	„ „ „ „
9 і 19 „	„ інтэрнацыянальна-класавага выхаваньня	„ „ „ „
14 і 27 „	„ грамадзка-карыснай працы, самакіраваньня і піянэр-руху	„ 7 „ „
9 і 29 „	„ палавога выхаваньня	„ 7 „ „
7 і 27 „	„ Пэдалёгічная асацыяцыя . . .	„ 7 „ „
4, 14 і 24 „	Гурток па маляваньні для настаўнікаў 1-га канцэнтру	„ 8 „ „
9, 19 і 29 „	„ па прадоўных працэсах для настаўнікаў 1-га канцэнтру	„ 8 „ „
4, 14 і 24 „	„ пэдалёгічны для дашкольніц . . .	„ 8 „ „
7, 17 і 27 „	„ ІЗО для дашкольніц	„ 8 „ „
8, 18 і 28 „	„ па плянаванні для дашкольніц . .	„ 7 „ „
8, 18 і 28 „	„ па грамаце для настаўнікаў «О» груп	„ 8 „ „
8, 18 і 28 „	„ па лічэньні для дашкольніц . .	„ 8 „ „
9, 19 і 29 „	„ па жывым слове для дашкольніц .	„ 8 „ „

— Дом — АСЬВЕТЫ. Субота 23 лістапада **КАНЦЭРТ** заслужанай артысткі рэспублікі прафэсара **М. ЭРДЭНКА**
вядомай артысткі Д. ГОЛЬЦЕР.
Пачатак а 9 гадзіне ўвечары.
Білеты прадаюцца ў ДОМЕ АСЬВЕТЫ з 12—2 г. і ад 6—10 г. увеч.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР
ЧАЦЬВЕР, 21 лістапада для рабочай моладзі. Білеты у Доме Камсамолу. **Ш. Дагановскі. Паядынак машын.**
Пятніца, 22 лістапада адкрыты спэктакль. Білеты ў рабкасе і ў касе тэатру.
Субота, 23 лістапада для саюзу харчавікоў. Білеты ў саюзе. Пачатак спэктакляў роўна а 8 г. 30 м.
Нядзеля, 24 лістапада для саюзу саўгандальслужачых. Білеты ў саюзе. Д. БЭРГЕЛЬСОН. **ГЛУХІ** Пачатак роўна а 8 г. 30 м.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА. Мастацкі замежны фільм **Праект інжынэра Строгга**. Звыш праграмы кіно-хроніка Белдзяржкіно. Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.
КІНО ІНТЭРВАЦЫЯНАЛ. 2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі. Амэрыканскі фільм **НЕБАСКРОБ**. Звыш праграмы хроніка „Совкино" № 60
КІНО ПАЛЕСТАРЫ. папулярны комік БЭСТЭР КІТОН у амэрыканскай камэдыі **ГЕНЭРАЛ** у 7 частках. Звыш праграмы кіно-хроніка „Совкино" № 64. Пачатак—а 7 г. увеч. Каса—ад 5 з пал. г.
1-шы дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР". **ЖЫВЫЯ ДАМЫ** у 5 частках вытворчасьця Белдзяржкіно. Звыш праграмы цікавая камэдыя **Адна з тых, якіх шмат** у 2 частках. Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня.
КІНО СПАРТАК. ГАСТРОЛІ ФРЫНЫ **КАЛЬЦОВАЙ**, выканальніцы сьпеваў быту, сьпеваў народаў. На экране мастацкі баявік **У горад уваходзіць нельга**. У гал. ролях А. М. Таідзе, Л. Л. Леанідаў, К. В. ЭГЕРТ. Пач. а 6 г. 30 м. Каса ад 5 г.

Ц. Праўленьне саюзу саўгандальслужачых ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО **20 лістапада, а 6 гадз. увеч. у памяшканьні клюбу саўгандальслужачых адбудзецца**
ПАСЯДЖЭНЬНЕ ЎНЕЧАРГОВАГА ПЛЕНУМУ ЦП СУМЕСНА З ПРАФАКТЫВАМ
па абгаварэньні вынікаў праверкі працы ЦП саюзу.

ПАДПІШЭЦЕСЯ ЗАГАДЗЯ НА СЬНЕЖАНЬ НА ГАЗЭТУ „ЗЬВЯЗДА"
орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.
«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісі

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоче-Крестьянский КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м. 25 к. (замест 30 к.)	1 м. 25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:
У Менску: Гал. к-рай газ. «Зьвязда», Савецкая, 63, яе ўпоўнаважанымі, газетным бюро і газэтаносцамі.
Па акругах: Упоўнаважанымі газэты „Зьвязда", кіёскамі т-ва Друку і усімі паштова-тэлеграфнымі канторамі.
СВАЯЧАСОВАЯ здача падпіскі ГАРАНТУЕ АКУРАТНУЮ І БЕСЬПЕРАПЫННУЮ ДАСТАЎКУ ГАЗЭТЫ.

ПАТРАБУЕЦЦА **ІНЖЫНЭР-БУДАЎНІК** па рабоч. жылбудаўніцтве.
Зварочвацца па адрасе: Сімфаропаль, Крымжылсаюз.
Да 20 лістапада—Менск, Савецкая гасьцініца, № 47 ад 5—8 гадз. увеч., упоўнаваж. Крымжылсаюзу т. Я. ГАРТАДЗЕ.

ПАТРАБУЕЦЦА ТЭРМІНОВА **ХАТНЯЯ ПРАЦАЎНІЦА**, якая добра ўмее варыць і выконваць усякую хатнюю работу, а таксама даглядаць за дзяцьмі (6 і 4 год) і гаварыць па-польску. Пажадана сярэдніх год. Адрас у канторы газ. «ЗЬВЯЗДА».

Беларускае аддзяленьне Усесаюзнага Энэргетычнага Камітэту СКЛІКАЕ **АГУЛЬНА-ГАРАДЗКУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ**
21 лістапада а 6 гадз. увечары ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ,
З НАСТУПНАЙ АБВЕСТКАЙ ДНЯ:
1. Інфармацыя аб арганізацыі Беларускага Аддзяленьня У. Э. К.
2. Аб цёплафікацыі і электраснабжэньні гор. Менску.
3. Бягучыя справы.
На канфэрэнцыю запрашаюцца інжынэры, тэхнікі і ўсе таварышы, якіх цікавяць пытаньні